

НЯМЕЦКІ КАПІТАЛ У БЕЛАРУСКАЙ ГЛЫБІНЦЫ

МС

ПЕРАКРЫЖАВАНАЕ ДОНАРСТВА: ШТО ГЭТА І НАВОШТА?



МС


Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 105 (28972)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Канцэрн «Белнафтахім»:** *«Канцэрн рэгулюе цану маторнага паліва на ўнутраным рынку, устанаўліваючы гранічныя максімальныя цэны на нафтапрадукты, у поўнай адпаведнасці з заканадаўствам. Розьнічныя цэны, якія ўстанаўліваюцца канцэрнам, вызначаюць верхнюю мяжу кошту паліва, а значыць, дэкларуюць абмежаванне на продаж паліва па больш высокіх цэнах. У сваю чаргу, сеткі АЗС могуць устанаўліваць любыя зніжкі самастойна. Усталяваць цэны па-за эканамічнымі правіламі, толькі па жаданні кіраўніка канцэрна або па патрабаванні групы грамадзян — немагчыма. Да таго ж менавіта паступовае змяненне цаны на паліва з'яўляецца стрымлівальным фактарам пры высокай валацільнасці кошту нафты на сусветным рынку».*



# Першае ралі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пяцігадовая Юля ДАЛГОВА з Полацка рыхтуецца да ўдзелу ў абласных асабіста-камандных спаборніцтвах па картынгу, якія пройдуць у гэтыя выхадныя ў Лепелі. Для юнай Юлі гэта будуць першыя спаборніцтвы. Яе трэнер — бацька Яўген — вядомы полацкі гоншчык па картынгу, які першы раз у жыцці сеў за руль спартыўнай машыны ў адзінаццаць гадоў. І таксама ў Лепелі атрымаў першую ўзнагароду найвышэйшай пробы.

## КОРАТКА

- У Віцебскай вобласці пражываюць 212 чалавек, старэйшых за 100 гадоў.
- **Міні-серыял «Чарнобыль», створаны амерыканскім тэлеканалам HBO сумесна з брытанскай тэлесеткай Sky, прызнаны найлепшым серыялам усіх часоў.**



- Савет ЕС прыняў папраўкі да правілаў Візавага кодэкса. Абноўленыя правілы, у прыватнасці, дазваляюць падачу дакументаў на атрыманне візы за паўгода, але не пазней чым за 15 дзён да паездкі.
- **У Гродне мужчына знайшоў каля дома дзве разарваныя купюры, наміналам $100 кожная. Дома склеіў купюры і адправіўся з імі ў абменны пункт. Яны аказаліся фальшывыя.**

# САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!

## Магістраль гатова сустрэць спартыўнае свята

**Яшчэ трохі — і ў сталіцы з'явіцца больш за 30 тысяч турыстаў на II Еўрапейскіх гульнях. Падрыхтоўка да гэтай падзеі на аб'ектах чыгуначнай станцыі Мінск-Пасажырскі амаль завершана. Пра тое, як тут будуць сустракаць гасцей горада, расказалі журналістам.** СТАР. 3




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Педагагічная майстэрня

# АКТЫЎНАЯ АЦЭНКА: НОВАЯ ФІЛАСОФІЯ,

## або Як настаўніку стаць эфектыўным?

**«Мне здаецца, што ўвесь час я працавала ў школе, а побач знаходзіліся дзверы з шыльдай «Так можна навучаць!» Часам яны былі зачыненыя, часам мне шчасціла прыадкрыць іх, зазірнуць, здзівіцца, але потым яны зноў зачыняліся. Актыўная ацэнка дапамагла адкрыць іх цалкам. І мне здаецца, што я ўжо стаю на парозе. Яшчэ рыхтуюся, але ўжо гатовая ўвайсці». Гэта прызнанне адной з настаўніц мінскіх школ, выпускніцы сёлетняга дыстанцыйнага курса «Стратэгіі актыўнай ацэнкі». За сем гадоў праз курс, які арганізуе Таварыства беларускай школы, прайшло ўжо больш за 500 чалавек.**
**А вось яшчэ адно прызнанне ад настаўніцы з Шаркаўшчыны: «Калі б не актыўная ацэнка... я не адкрыла б для сябе сваіх вучняў. Часам непаслухмяных, занадта гарэзлівых, але такіх, якія вучыліся разам са мной: выпрацоўвалі крытэрыі ацэнкі, пісалі каментарыі. Я бачу змены ў іх навучанні і адносінах паміж сабой. Гэтаму іх навучыла работа з самаацэнкай і ўзаемаацэнкай. Знікае боязь, перажыванне, што нечага не ведаеш, узрастае давер».** СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям XV Рэспубліканскага экалагічнага форуму.**

**«Зберагаючы прыроду роднага краю, распрацоўваючы стратэгію разумнага і эканомнага выкарыстання яе рэсурсаў, вы клапоціцеся пра будучыя пакаленні, здароўе і дабрабыт нашых дзяцей і ўнукаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.**

**«Адказнасць за экалагічную бяспеку планеты сёння ў роўнай ступені дзеляць сусветныя лідары, грамадскія аб'яднанні, вытворцы і спажыўцы выгод цывілізацыі — усе жыхары Зямлі. Для кожнага з нас беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя павінны стаць ладам мыслення і нормай жыцця, для дзяржаў і саюзаў — прыярытэтным напрамкам дзяржаўнай палітыкі», — гаворыцца ў прывітанні.**

# МЫ ЖЫВЁМ У ДОБРЫМ МЕСЦЫ



**Даныя нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя сведчаць аб тым, што яно ў нашай краіне на працягу ўжо многіх гадоў у цэлым застаецца стабільна спрыяльным, паведаміў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.**

**Сёння ў Навагрудку пачынае работу XV Рэспубліканскі экалагічны форум.** Як растлумачыў міністр, гэтым разам спецыяльная тэма мерапрыемства — «Устойлівае развіццё малых гарадоў: глабальныя выклікі і лакальныя рашэнні». Праграма форуму арыентавана на рэалізацыю выканання даручэнняў Прэзідэнта па навядзенні парадку на зямлі і азеляненні, стварэнні спрыяльных умоў пражывання ў гарадах, эфектыўнай сістэмы абыходжання з адходамі, захаванні біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці для будучых пакаленняў і іншых найважнейшых даручэнняў па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя.

Міністр заявіў, што спецыяльная тэма форуму адлюстроўвае адну з ключавых задач, якія стаяць перад нашай краінай і ўсёй сусветнай супольнасцю: захаванне прыродных рэсурсаў для будучых пакаленняў.

Андрэй Худык адзначыў, што асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі да 2035 года павінны складаць не менш як 9 % ад плошчы краіны. Таксама неабходна забяспечыць аднаўленне колькасці рэдкіх і якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення відаў дзікіх жывёл і дзікарослых раслін. На цяперашні момант у нашай краіне зарэгістравана 1289 нацыянальных паркаў, запаведнікаў, заказнікаў і помнікаў прыроды, якія адносяцца да асабліва ахоўных прыродных тэрыторый.

У 2018 годзе наша краіна атрымала фінансаванне Глабальнага экалагічнага фонду для рэалізацыі двух буйнамаштабных праектаў па кіраванні небяспечнымі рэчывамі (адходамі) з агульным аб'ёмам фінансавання больш за 12 млн долараў, што дазволіць выканаць цэлы комплекс мерапрыемстваў па абыходжанні з устойлівымі арганічнымі забруджвальнікамі (УАЗ), а таксама сістэмна вырашыць гэтую праблему ў краіне. Да 2020 года плануецца стварыць аб'ект па экалагічна бяспечным знішчэнні УАЗ і іншых небяспечных адходаў у аб'ёме да 1,5 тысячы тон у год на базе комплексу па перапрацоўцы і пахаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці.

Акрамя гэтага, у нас **плануецца правесці геалагічнае картаванне ўсёй тэрыторыі краіны,** адзначыў Андрэй Худык.

«Выбіраем перш за ўсё тыя тэрыторыі, якія патэнцыйна ўтрымліваюць карысныя выкапні, — расказаў Андрэй Худык. — Безумоўна, для гэтага неабходна фінансаванне. Новая праграма па геалагічнай картаванні будзе дзейнічаць у 2021—2025 гадах. Думаю, нам удасца гэта зрабіць».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Парламенцкі дзённік

# ПАЧАТАК ВЯЛІКАГА ШЛЯХУ

## Адносіны Беларусі і Канады знаходзяцца на першаснай стадыі

**Аб гэтым заявіла намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яна ШЧОТКІНА на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Канады ў Польшчы і Беларусі па сумяшчальніцтве Льюіс СКЭНЛАН. Цікава, што гэта першая сустрэча з прадстаўнікамі Канады ў верхняй палаце Нацыянальнага сходу.**



Фота БелТА.

«На мой погляд, кантакты паміж Канадай і Беларуссю знаходзяцца толькі на пачатковай стадыі, — сказала Мар'яна Шчоткіна. — Вядома, тое, што ў нас гандлёвы абарот складае менш за 50 млн долараў, — гэтага вельмі недастаткова. Я са шкадаваннем адзначыла, што тавараабарот упаў. І нават за кароткі перыяд 2019 года тавараабарот знізіўся амаль на 50 %».

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі паведаміла, што гэты паказчык склаў менш за 10 млн долараў. На яе думку, гэта сведчыць аб тым, што Беларускай гандлёва-прамысловай палаце і канадскім партнёрам неабходна наладзіць больш узаемадзеянне.

Віцэ-спікер верхняй палаты звярнула ўвагу, што ў Канадзе прадстаўлены інтарэсы «МТЗ» і «БелАЗа», аднак гэта ўсё ж толькі пачатак супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў.

«У нас у парламенце створана група дружбы з Канадай, але парламенцкі складнік таксама пакуль вельмі нязначна развіты, — сказала Мар'яна Шчоткіна. — Я разумею, што ў нас гэта пачатак шляху, пачатак вялікага супрацоўніцтва, таму і Сенат, і Палата абшчын [яны складаюць канадскі парламент. — **«Звязда»**] таксама будуць цікавіцца супрацоўніцтвам з Беларуссю».

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі асобна спынілася на гуманітарным складніку адносін. На яе думку, беларускія ўніверсітэты могуць зрабіць шмат для развіцця культурных сувязяў з Канадай.

Таксама віцэ-спікер выказала надзею, што Беларусі ўдасца лепш даведацца пра Канаду праз турызм. Пакуль у нас не вельмі шмат адтуль гасцей, ды і беларусы нячаста наведваюць гэтую дзяржаву. «Мяркую, турыстычныя лініі нам таксама трэба развіваць, мы будзем усяляк гэтаму садзейнічаць», — дадала яна.

Мар'яна Шчоткіна падкрэсліла: Беларусь вельмі шануе Канаду як дзяржаву і як народ. Гэта ў тым ліку звязана з тым, што Канада адной з першых прыйшла на дапамогу пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. «Гэта неацэнна, калі ты адчуваеш, што не адзін у гэтым свеце», — канстатавала намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

Яна таксама расказала, што з захапленнем успрыняла прызначэнне Льюіс Скэнлан у якасці пасла ў нашу краіну. «Я думаю, што калі за справу бяруцца жанчыны, то гэта справа прасоўваецца значна хутчэй. Мы з вамі павінны зрабіць вельмі шмат для нашых дзяржаў і для людзей, якія жывуць у іх», — адзначыла віцэ-спікер.

Рэзюмуючы сказанае, Мар'яна Шчоткіна пацвердзіла, што Беларусь вельмі зацікаўлена ў развіцці кантактаў з Канадай — перш за ўсё парламенцкіх. Пры гэтым вялікае значэнне для нас мае наладжванне сувязяў па дасягненні Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года.

У адказ Льюіс Скэнлан заявіла, што для Канады найважнейшым прыярытэтам з'яўляецца развіццё эканамічных адносін. Дарэчы, інфармацыя пра іх: у 2018 годзе гандлёвы абарот паміж Беларуссю і Канадай склаў 45,7 млн долараў і скараціўся на 21,4 % да ўзроўню 2017. Істотна знізілася адмоўнае сальда: з 33,8 млн долараў у 2017 годзе да 2,9 млн долараў у 2018 — у 11,5 раза.

За 2018 год з Канады паступіла інвестыцый на суму 6,9 млн долараў (79,6 % да 2017 года), у тым ліку 4,9 млн долараў прамых інвестыцый.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Блізкая ўлада

## ПЫТАННІ І ІХ РАШЭННІ

**Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 8 чэрвеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На званкі з 9.00 да 12.00 у суботу адкажуць:**

наменснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатольеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Васілевіч КРАЎЦОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Іванавіч ХАРЫТОНЧЫК. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

# Звароты з культурным акцэнтам

## Прыём грамадзян правёў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ



**Гродзенцы агучылі свае прапановы па развіцці культурнай прасторы. Сярод іх — пашырэнне беларускамоўнага асяроддзя, стварэнне ў горадзе мастацкага музея і ўвекавечванне памяці славутых землякоў.**

Група гродзенцаў звярнулася з амбіцыёзным праектам — стварыць у горадзе мастацкі музей. Прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі бачаць гэтую ўстанову ў былым палацы тэкстыльшчыкаў. У хуткім часе тут пачнецца рэканструкцыя, і будынак будзе перапрафіляваны.

Па словах мастацтвазнаўцы Наталлі Паўленкі, мастацкія музеі ёсць ва ўсіх абласных і некаторых раённых цэнтрах. У Гродне такой установы няма — існуюць асобныя выставачныя залы, некаторыя экспазіцыі месцяцца ў замках, альбо іншых месцах. У той жа час у Гродне ёсць і мастацкая школа, і каледж, і факультэт у ГрДзУ. У Гродне працуе немала таленавітых мастакоў, тут можна прымаць іх калег з іншых краін з творчымі работамі. З цягам часу мастацкі кірунак мае ўсе падставы стаць такім жа папулярным у горадзе, як музычнае і тэатральнае мастацтва, сцвярджаюць прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі. Яны адзначылі, што мастацкі музей — гэта таксама твар горада, свайго роду Эрмітаж для Гродна.

Абласныя і гарадскія ўлады, як паведаміў Уладзімір Краўцоў, бачаць рэалізацыю гэтага праекта больш пашыранай. Напрыклад, можна стварыць у былым палацы тэкстыльшчыкаў не проста мастацкі музей, а вялікі культурны цэнтр, дзе будуць размешчаны экспазіцыя гісторыі XX стагоддзя і музей прыроды, які цяпер знаходзіцца ў старым замку і павінен адтуль пераехаць. Па словах спецыялістаў аблвыканкама, фондаў для аднаго толькі мастацкага музея недастаткова. Такая ўстанова разлічана на мэтавых наведвальнікаў, а культурны цэнтр у гэтым сэнсе можа прапанаваць больш шырокі дыяпазон.

У горадзе ёсць яшчэ некалькі аб'ектаў, якія могуць прэтэндаваць на мастацкае напаўненне. Гэта гістарычны будынак першай на Беларусі медыцынскай акадэміі, які зараз пустуе і чакае інвестара. Такі ж лёс і яшчэ аднаго архітэктурнага помніка перыяду канструктывізму, — былога Дома афіцэраў. Усе названыя будынкі могуць стаць прыдатнымі для гэтых мэт, адзначыў Уладзімір Краўцоў.

Яшчэ некалькі прапаноў агучылі гродзенцы Аляксандр Місцюкевіч і Віктар Парфёненка. На думку грамадскіх актывістаў, у горадзе недастаткова візуальнай інфармацыі на беларускай мове. Дарэчы, заяўнікі паведамілі, што зараз актыўная работа ў гэтым кірунку вядзецца з адміністрацыяй Гродзенскага заапарка.

Таксама прагучала прапанова ўшанаваць памяць пісьменніка Васіля Быкава, які жыў і працаваў у Гродне. Гродзенцы не ўпершыню звяртаюцца да ўлад з гэтым пытаннем. Абласная арганізацыя Таварыства беларускай мовы гатова знайсці сродкі на шыльду, але на гэта павінна быць згода мясцовых улад.

Уладзімір Краўцоў паведаміў, што гэтае пытанне не застаецца па-за ўвагай. Вызначаны пэўныя месцы ў Гродне, дзе зафіксавана дзейнасць Васіля Быкава. Ёсць музей у рэдакцыі газеты «Гродзенская праўда», дзе ён працаваў, ёсць асобныя экспазіцыі. У гэтым кірунку ўжо прынята рашэнне: мемарыяльны пакой будзе арганізаваны ў доме-музеі Максіма Багдановіча, у той частцы, якая пакуль жылая. Калі яна вызваліцца, а жыхары пераселяцца, гэтая палова адыдзе пад музей Васіля Быкава. Было таксама ўзнята пытанне па ўвекавечванні памяці Кастуся Каліноўскага. Асобы, якія пакінулі свой след у гісторыі, будуць цікавы для турыстаў, лічаць гродзенцы.

— Тэмы духоўнага развіцця, падтрымкі гісторыка-культурнай спадчыны, на якія багатая наша вобласць і горад, — гэта свайго роду сігналы, якія дазваляюць уладам правільна зарыентавацца ў сваіх дзеяннях і больш разумна, калі прамісна рэалізоўваць тыя дзеянні, якія мы таксама трымаем у цэнтры ўвагі, — гэта культурнае развіццё рэгіёна. Тым больш што ў наступным годзе Ліда будзе культурнай сталіцай Беларусі. У Слоніме сёлета пройдзе Дзень беларускага пісьменства. Гэта сугучна з тымі прапановамі, якія прагучалі адносна пашырэння беларускамоўнага і культурнага асяроддзя, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Вакзал станцыі Мінск-Пасажырскі — гэта першы пункт прызначэння, куды прыязджаюць турысты, каб пазнаёміцца са сталіцай. Таму для нас было важна зрабіць усё магчымае, каб ім было ўтульна. Праца па ўдасканаленні аб'ектаў праводзілася паўтара года. Мы замянілі большасць паказальнікаў і табло, устанавілі новыя даведачныя тэрміналы і тэрміналы самаабслугоўвання, абнавілі сістэму кандыцыянавання. На тэрыторыі вакзала ёсць бясплатны wi-fi, у выпадку неабходнасці кожны можа звязацца з кантакт-цэнтрам. Таксама для арганізацыі камфорту турыстаў больш за 200 супрацоўнікаў Беларускай чыгункі прайшлі навучанне на курсах англійскай мовы, — адзначыў **начальнік станцыі Мінск-Пасажырскі Віктар НІЗОХІН.**

Змяненняў да летняй спартыўнай падзеі зроблена нямала. Для асоб з абмежаванымі магчымасцямі створана безбар'ернае асяроддзе: для зручнасці арыентавання тых, хто слаба бачыць, на лесвіцах нанесены спецыяльныя палосы бяспекі жоўтага колеру, а на ўсіх уваходных дзвярах вакзала — жоўтыя кругі. На Прывакзальнай плошчы, каля будынка гасцініцы «Экспрэс», выкладзеная тактыльная плітка і накіравальная лініі. Рамонт у самім будынку ўсё яшчэ працягваецца, у хуткім часе 29 нумароў адновяць свой знешні выгляд. Дарэчы, надпісы ў ліфтах гасцінічнага комплексу прадубляваныя шрыфтам Брайля.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Змянілася і сістэма руху цягнікоў, пра што расказаў **начальнік пасажырскай службы Беларускай чыгункі Аляксандр ДРОЖА:**

— З 22 да 30 чэрвеня на ўчастку Мінск—Масюкоўшчына штодня будуць курсіраваць 57 цягнікоў, у зваротным напрамку — 62 цягнікі. Па маршруце, дзе знаходзяцца тры буйныя аб'екты — стадыён «Дынама», «Мінск-Арэна» і Вяслярны канал — колькасць саставаў павялічыца ўдвая. Паміж Масквой і Мінскам графік праездаў будзе складацца з васьмі пар цягнікоў, паміж Санкт-Пецярбургам і Мінскам ды Кіевам і Мінскам — па дзве пары. З 16 чэрвеня да 14 ліпеня будзе курсіраваць дадатковы цягнік «Брэст—Варшава».

Супрацоўнік Беларускай чыгункі дадаў, што аплаціць квіткі можна ў чыгуначных касах, праз плацежна-даведачныя тэрміналы самаабслугоўвання, за наяўны разлік і з дапамогай смарт-картак і бескантактавых банкаўскіх картак.

А якія змяненні чакаюць турыстаў і жыхароў сталіцы, калі зайсці ў будынак вакзала? Былі заменены эскалатары, кандыцыянеры ў касавых залах, праведзены рамонт санітарных вузлоў і пакоя адпачынку для пасажыраў з дзецьмі. Мадэрнізаваны элементы прасторавай навігацыі — піктаграмы і інфармацыйныя паказальнікі. У зале чакання абсталявана 36 спецыяльных месцаў для людзей, якія карыстаюцца кіямі, шэсць месцаў для людзей, што перасоўваюцца на інвалідных калясках. На першым паверсе ўжо функцыянуе Інфармацыйны цэнтр Еўрапейскіх гульняў, супрацоўнікі якога на англійскай мове дадуць карысныя і патрэбныя звесткі, сарыентуюць па горадзе, спартыўных аб'ектах і транспарце.

Цікава, што асаблівай папулярнасцю падчас правядзення Еўрапейскіх гульняў карыстаецца прагляд спаборніцтваў у зале чакання. Трансляцыя на вакзале будзе праводзіцца на чатырох экранах. Для таго каб працягнуць і зацікавіць турыстаў, у холе ўсталявалі фотазону, якая пасля свята будзе мяняцца ў адпаведнасці з парой года. На прывакзальнай плошчы гасцей будзе сустракаць талісман гульняў лісяня Лёсік, а таксама неад'емнымі атрыбутамі падзеі стануць тэматычныя плакаты на станцыях, вакзалах і цягніках Беларускай чыгункі. Работнікам магістралі будуць дапамагаць валанцёры.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

## Лёгкаатлеты абвясцілі склад

**Спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы на II Еўрапейскіх гульнях пройдуць з 23 да 28 чэрвеня на стадыёне «Дынама» ў новым фармаце — «Дынамічная новая лёгкая атлетыка» (DNA).**

**У турніры возьмуць удзел 24 каманды. У праграму спаборніцтваў уключаны бег 100 м (мужчыны, жанчыны), бег 110 м з бар'ерамі (мужчыны), бег 100 м з бар'ерамі (жанчыны), кіданне кап'я (мужчыны, жанчыны), скачкі ў даўжыню (мужчыны, жанчыны), скачкі ў вышыню (мужчыны), эстафеты бег 4х400 м (дзве жанчыны, двое мужчын) і змешаная эстафета ў выглядзе гонкі праследавання (дзве жанчыны, двое мужчын).**

У каманду, якая выступіць на Гульнях, увайшлі Марына Арзамасава, Эльвіра Герман, Анастасія Міронічык-Іванова, Тацяна Халадовіч, Максім Недасекаў, Крысціна Ціманоўская, Віталь Парахонька, Станіслаў Дарагакупец, Руслана Рашкаван, Аляксей Лазараў, Марына Міхан, Юлія Касцючкова, Ян Слома, Віялета Скварцова, Ігар Зубко, Аляксандр Васілеўскі, Ілья Карнавухаў, Андрэй Скабейка, Крысціна Мулярчык, Максім Грабарэнка, Дар'я Барысевіч.

## Кругласутачная сувязь з мытняй

**Аператыўна-інфармацыйны цэнтр мытных органаў, створаны на перыяд правядзення II Еўрапейскіх гульняў, пачынае сваю работу з 7 чэрвеня.**

Call-цэнтр, у які змогуць звярнуцца па аператыўную і кампетэнтную кансультацыю як фізічныя, так і юрыдычныя асобы, будзе працаваць кругласутачна да 7 ліпеня. Супрацоўнікі мытных органаў будуць інфармаваць усіх ахвотных па пытаннях, звязаных з перамяшчэннем праз мытную мяжу асабістай маёмасці, спартыўнага абсталявання і інвентару, транспартных сродкаў. Кансультацыю будуць аказваць на рускай і англійскай мовах па тэлефоне, запраграмаваным у шматканальным рэжыме: (8017) 218 94 26. У кожнай мытні таксама будуць функцыянаваць аператыўна-інфармацыйныя групы. Нумары тэлефонаў для кансультацый пазначаны на адзіным інтэрнэт-партале мытных органаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Сацыяльны праект

# БЯСПЕЧНЫ ІНТЭРНЭТ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ

**Як сфарміраваць у дзяцей навыкі бяспечных стасункаў у інтэрнэце? Як зрабіць гэта максімальна карысна? Такога кшталту пытанні бацькоў не застаюцца без адказаў. Дапамагае ім у гэтым Міністэрства адукацыі і кампанія МТС, якія днямі заключылі пагадненне аб супрацоўніцтве і працягваюць сумесныя праекты.**

Пагадненне на 2019—2020 гады падпісалі ў прэс-цэнтры БелТА **першы намеснік міністра адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА і генеральны дырэктар кампаніі МТС Уладзімір КАРПОВІЧ.**

### ЭТЫКЕТ, ІНТЭРНЭТ-ПІСЬМЕННАСЦЬ І БЯСПЕКА

Дарэчы, гэтае пагадненне партнёры змацоўваюць подпісамі ўжо чацвёрты раз. Па словах Ірыны Старавойтавай, супрацоўніцтва з МТС будуецца на прынцыпах доўгачасовасці і стабільнасці. Ужо не першы год рэалізуюцца разнастайныя праекты, якія дапамагаюць маладым людзям упэўнена адчуваць сябе ў інтэрнэт-супольнасці. У тым ліку праводзіцца актыўная работа з педагогамі па фарміраванні адказных паводзін на стаўнікаў у сацыяльных сетках, накіраваная на размежаванне прафесійнай і асабістай інфармацыі ў інтэрнэце. Асноўная тэма супрацоўніцтва дзвюх структур — навучанне школьнікаў сеткаваму этыкету, інтэрнэт-пісьменнасці, кібербяспецы.

«Сумесная ініцыятыва з Міністэрствам адукацыі дае магчымасць весці дыялог з дзецьмі, — адзначыў Уладзімір Карповіч. — Адна з формаў работы — інтэрактыўная экспазіцыя «Сусвет інтэрнэту». Спадзяемся, што далейшае супрацоўніцтва з міністэрствам будзе такім жа эфектыўным, як і папярэднія гады».




Пачатак сацыяльна-адукацыйнаму супрацоўніцтву Міністэрства адукацыі і МТС быў пакладзены ў 2016 годзе. За гэты час былі сумесна арганізаваны і атрымалі развіццё такія сацыяльна значныя праекты, як «Дзеці ў інтэрнэце», «Адказныя паводзіны настаўнікаў у сеціве», «IT-лагер». Па праекце «Дзеці ў інтэрнэце» бяспечным паводзінам у сеціве ўжо навучана больш за дзевяць тысяч школьнікаў ва ўсіх абласцях краіны. Урокі сеткавага этыкету працягнуцца сёлета.

Летась праект трансфармаваўся ў навучальную інтэрактыўную выставу «Сусвет інтэрнэту», якая паспяхова працавала ў Мінску і Гомелі, дзе яе наведалі больш за шэсць тысяч дзяцей.

### СУЧАСНЫЯ КАНІКУЛЫ І ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПРАЕКТЫ

Хутка выстаўка адкрыецца ў нацыянальным адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня». Больш за чатыры тысячы беларускіх і замежных школьнікаў будуць вучыцца бяспечным паводзінам у інтэрнэце на летніх канікулах. А ў пачатку навучальнага года з выстаўкай пазнаёмяцца юныя жыхары Гродна.

**Кіраўнік групы па сувязях з грамадскасцю кампаніі МТС Вікторыя ЗДЗЯРСКАЯ** расказала, што інтэрактыўная выстаўка «Сусвет інтэрнэту», адкрытая летась у Нацыянальнай бібліятэцы, складаецца з некалькіх зон, якія паказваюць у гульнявым фармаце, як правільна паводзіць сябе ў сеціве, як развіваўся інтэрнэт, як абараніць свае гаджэты ад шкодных праграм.

Ужо стаў традыцыйным рэспубліканскі конкурс «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу» сярод старшакласнікаў і студэнтаў. За час яго правядзення там было прадстаўлена амаль 300 інавацыйных праектаў.

Новае развіццё атрымае праект «IT-лагер»: сёлета ён будзе арганізаваны для выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў Брэсцкай вобласці. Інтэнсіў па сучасных інфармацыйных тэхналогіях правядуць спецыялісты адукацыйнага цэнтра Парка высокіх тэхналогій. Працягнецца сумесная работа па фарміраванні адказных паводзін у інтэрнэце самых педагагічных работнікаў, каб дапамагчы настаўнікам карэктна і без рызыкі для рэпутацыі мець стасункі з вучнямі ў інтэрнэце. За час існавання праекта такое навучанне прайшло амаль 900 педагогаў.

«Супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі і МТС — выдатны прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў рэалізацыі найважнейшых ініцыятыў у адукацыі. З дапамогай такіх сумесных праектаў па-за рамкамі школы мы можам вырашыць канкрэтную задачу — павысіць інтэрнэт-пісьменнасць падрастаючага пакалення і засцерагчы нашых дзяцей ад негатыўнага ўплыву тэхналогій», — адзначыла Ірына Старавойтава.

**Сяргей КУРКАЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**




УНП 800013732

# АКТЫЎНАЯ АЦЭНКА: НОВАЯ ФІЛАСОФІЯ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Актыўная ацэнка (АА) — менавіта так называюць у Беларусі тэхналогію Formative Assessment (дынамічнае ці фарміравальнае ацэньванне), якая стала ў сусветнай адукацыі мэйнстрымам. Прыхільнікі актыўнай ацэнкі называюць яе новай адукацыйнай філасофіяй. Яна складаецца з важных элементаў, якія дапамагаюць зрабіць працэс навучання больш скіраваным на асобу кожнага вучня, падказвае, у якім кірунку яму рухацца далей, матывуе і прымушае браць на сябе адказнасць за свае веды, але прынцыпова пазбягае канкурэнцыі. Гэта інтэрактыўная тэхналогія, заснаваная на пастаяннай зваротнай сувязі. Чаму філасофія? Таму што патрабуе ад педагога прыняць новую ролю і адмовіцца ад стэрэатыпаў, якія склаліся ў традыцыйнай адукацыйнай мадэлі.

Між іншым, сёлета спаўняецца дзесяць гадоў, як актыўная ацэнка дзякуючы групе настаўнікаў-энтузіястаў прыйшла ў нашу краіну. Які шлях быў пройдзены за гэты час і што змянілася ў стаўленні да актыўнай ацэнкі з боку кіраўнікоў сістэмы адукацыі, навучальных устаноў і педагогаў? Пра ўсё гэта разважалі на фестывалі педагагічных ідэй «Стратэгіі актыўнай ацэнкі для эфектыўнага навучання: найлепшыя адукацыйныя практыкі», які прайшоў у сценах Акадэміі паслядыпломнай адукацыі (АПА).




У педагагічнай майстэрні Элы ЯКУБОЎСКАЙ і Алены АНАНЧЫКАВАЙ.

## Не для ацэнкі, а для навучання

— Гатоўнасць да перамен, адказнасць, творчасць, самастойнасць у прыняцці рашэнняў — вельмі важныя якасці для сучаснага педагога, — падкрэслівае **начальнік Цэнтра прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі АПА Алена РАДЗЕВІЧ.** — І трэба шчыра адказаць сабе на пытанне: а ці гатовы я да перамен у прафесійнай дзейнасці, асабліва калі давядзецца быць у сваім акружэнні «белай варонай»? Таму што любыя перамены — гэта выхад з зоны камфорту: даводзіцца змяняць свае педагагічныя звычкі, падыходы і метады працы...

Дзесяць гадоў таму невялікая група настаўнікаў і выкладчыкаў з розных устаноў адукацыі ў летні час сабралася разам на семінарах па ацэначнай дзейнасці, якія арганізавала Таварыства беларускай школы. І раптам педагогі знайшлі адказы на пытанні, якія хвалявалі іх многія гады: як павысіць паспяховасць вучняў, як іх матываваць і зрабіць адказнымі за ўласнае навучанне... З 2012 года ў АПА была распрацавана і рэалізуецца праграма навучальных курсаў «Актыўная ацэнка як новая стратэгія навучання». У 2013—2015 гадах быў паспяхова рэалізаваны інавацыйны праект па ўкараненні мадэлі актыўнай ацэнкі на базе 11 устаноў адукацыі. АА пачала ўкараняцца ў сістэму павышэння кваліфікацыі педагогаў розных катэгорый. Ідэя распаўсюджвалася ўсё шырэй і шырэй, як кругі на вадзе. Нашы педагогі праходзілі складаны шлях ад разумення некаторых элементаў актыўнай ацэнкі да прыняцця філасофіі, больш глыбінных працэсаў, якія стаяць за гэтай тэхналогіяй.

— Сродкі актыўнай ацэнкі прызначаны, у першую чаргу, не для ацэньвання, не для кантролю, не для выстаўлення адзнак, а для навучання, — падкрэслівае **прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі АПА Мікалай ЗАПРУДСКІ.**

Цікавыя вынікі былі атрыманы падчас анкетавання настаўнікаў. Ім прапанавалі адказаць на пытанне: «Чым абумоўлены вашы поспехі ў прымяненні АА?» Больш за 59 % паведамілі пра падтрымку вучняў. 55 % апытаных канстатавалі, што ім было лёгка адмовіцца ад стэрэатыпаў. Палова рэспандэнтаў сказалі, што адчуваюць падтрымку калег з іншых устаноў адукацыі (праз адмысловы сайт «Актыўная ацэнка» http://aacenka.by). А вось **падтрымкай з боку калег у сваёй школе змаглі пахваліцца толькі 15,5 % актыўных ацэншчыкаў.** 59 % педагогаў, якія ўкараняюць актыўную ацэнку на сваіх уроках, канстатуюць, што з боку вучняў павысілася адказнасць за вынікі навучання.

## Даеш зваротную сувязь!

— З кожным годам да руху педагогаў, якія пажадалі перагледзець свае метады навучання, далучаюцца ўсё новыя энтузіясты. Адбываецца сапраўдная ланцуговая рэакцыя, — падкрэслівае Мікалай Запрудскі. — Многія абаранялі свой вопыт прымянення актыўнай ацэнкі на кваліфікацыйных экзаменах на вышэйшую катэгорыю і катэгорыю «настаўнік-метадыст», дэманстравалі работу па тэхналогіі АА на рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства «Настаўнік года». Было напісана 6 кніг, выйшла каля 100 артыкулаў у педагагічнай прэсе, створаны канал АА на YouTube. Пагалоска пра нашу актыўную ацэнку распаўсюдзілася і за межы краіны. Да нас у акадэмію, каб засвоіць тэхналогію АА, прыязджаюць кіраўнікі школ і настаўнікі з Расіі. Знаёміліся з актыўнай ацэнкай у акадэміі і педагогі з Еўропы (у рамках праграмы «Песталоцы»). Беларускія актыўныя ацэншчыкі праводзілі майстар-класы ў Расіі і ва Украіне. Тэхналогія актыўнай ацэнкі надта значная і эфектыўная, каб ігнараваць яе і безуважна назіраць, як па ёй працуюць настаўнікі ў больш паспяховых краінах і школах...

— Усім раю звярнуцца да кнігі аўстралійскага прафесара Джона Хэці «Бачнае навучанне». Гэта самае маштабнае ў свеце даследаванне ў галіне доказнай педагогікі, якое ўтрымлівае адказы на крытычна важныя пытанні сучаснай адукацыі, — кажа **намеснік старшыні Таварыства беларускай школы Тамара МАЦКЕВІЧ.** — Першая кніга выйшла ў 2009 годзе. Прааналізаваўшы за 15 гадоў вынікі больш чым 50 000 даследаванняў ва ўсім свеце з сумарным ахопам больш за 86 мільёнаў школьнікаў, Джон Хэці распрацаваў своеасаблівы «барометр», які паказвае ўплыў канкрэтных фактараў на навучанне. Чым вышэйшае значэнне паказчыка, тым большы ўплыў на якасць навучання аказвае тая прычына.




Мікалай ЗАПРУДСКІ: «Старайцеся зрабіць актыўную ацэнку прыналежнасцю ўсёй школы».

Высветлілася, напрыклад, што ў найменшай ступені на якасць уплываюць дамашнія заданні, індывідуалізацыя навучання, колькасць вучняў у класе, падзел на групы па здольнасцях і паўторнае навучанне (пакіданне вучня на другі год). А найбольш высока Джон Хэці ацэньвае існаванне зваротнай сувязі паміж настаўнікам і вучнем (толькі разгорнутая зваротная сувязь істотна карэлюе з высокімі дасягненнямі), ну і, вядома, настаўніцкія чаканні. Педагог павінен верыць, што ўсе дзеці могуць вучыцца і развівацца, што навучальныя вынікі любога з іх могуць змяніцца да лепшага, бо не з'яўляюцца раз і назаўсёды зададзенай велічынёй. У апошнім даследаванні 2018 года Хэці дадаў новыя фактары ўплыву. **Найбольш высокі каэфіцыент (1,57) ён выставіў супрацоўніцтву настаўнікаў: калі педагогі маюць агульныя каштоўнасці, адну мэту, супрацоўнічаюць, у іх добрая атмасфера, яны раяцца, давяраюць адно аднаму — гэта магутная сіла. Калектыўная эфектыўнасць залежыць ад каштоўнасцяў, якія падзяляюць члены супольнасці.**

## АА для ліцэістаў-перфекцыяністаў

**Кацярына СКРЫГАН, настаўніца біялогіі сталічнага ліцэя № 1,** — навабранец у арміі прыхільнікаў актыўнай ацэнкі. У бягучым навучальным годзе яна вучылася на дыстанцыйным курсе і адначасова ўкараняла тэхналогіі актыўнай ацэнкі на факультатыве ў 10-х профільных хіміка-біялагічных класах. Спецыфіка заключалася ў тым, што на факультатыве адзнакі навучэнцам увогуле не выстаўляюцца, а вось актыўная ацэнка прыйшлася ліцэістам па душы.

— Самымі прыцягальнымі элементамі ў актыўнай ацэнцы для іх аказаліся ключавыя пытанні: ад іх яны аж «пішчалі», у іх заблішчэлі і загарэліся вочы, — смяецца Кацярына. — Але для профільных класаў, у якіх навучаюцца добра падрыхтаваныя дзеці, трэба вельмі пастарацца, каб прыдумаць пытанні, якія зачэпяць вучняў і на якія яны не знойдуць адразу адказ. Таму я прапанавала б настаўнікам біялогіі аб'яднаць свае намаганні і стварыць разам базу ключавых пытанняў па нашым прадмеце. Шмат ключавых пытанняў нараджаецца з пытанняў саміх вучняў — толькі настаўніку трэба ўключыць пастаянны рэжым назіральнасці...

Пастаноўку мэтаў на ўрок, як я пераканалася, можна смела дэлегаваць маім навучэнцам: для матываваных дзяцей важна разумець, што і для чаго яны робяць на ўроку і што яны возьмуць у выніку з сабой.

Сярод ліцэістаў шмат перфекцыяністаў, якія хвалююцца, ці ўсё яны зрабілі дастаткова добра. Таму крытэрыі выканання задання, якія я ім даю, пайшлі «на ўра». Калі проста скажаш навучэнцам: «Падрыхтуй даклад па тэме антыбіётыкаў», нічога не канкрэтызуючы, то можаш атрымаць усё што заўгодна. У канцы года я дала заданне падрыхтаваць даклад па мікрабіялогіі і загадзя прапісала ўсё, што павінна быць у гэтых работах, а затым сядзела і атрымлівала асалоду ад пачутага. Крытэрыі ацэньвання — вельмі важны псіхалагічны момант, навучэнцы ведаюць, што трэба зрабіць, каб дасягнуць мэты.

Зваротная сувязь была для маіх навучэнцаў абсалютна новай з'явай, яны доўга да яе прывыкалі, затое цяпер кажуць: «Вось бы ўсе настаўнікі так працавалі». Унізе рэйтынгу аказаліся самаацэнка і ўзаемаацэнка. Я знайшла гэтаму наступнае тлумачэнне: мы працуем у ліцэі з падлеткамі, якія рыхтуюцца да паступлення, і навык самастойнай працы для іх больш важны, але гэта мая гіпотэза.

Вось што кажа пра актыўную ацэнку адзін з вучняў Кацярыны Скрыган: «Мне спадабалася ідэя з актыўнай ацэнкай, таму што з ёй у цябе ёсць магчымасць ацаніць сябе не толькі па балах, але і па ведах. Спадабалася, што актыўная ацэнка дазваляе ўбачыць, дзе трэба падвучыцца ці, наадварот, дзе ў цябе ўсё атрымліваецца».

## Больш «белых варон»

Рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу сродкамі актыўнай ацэнкі была прысвечана педагагічная майстэрня, якую арганізавалі для калег **настаўнік-метадыст Эла ЯКУБОЎСКАЯ (гімназія № 1 г. Жодзіна) і намеснік дырэктара жлобінскай сярэдняй школы № 13 , настаўнік-метадыст Алена АНАНЧЫКАВА.** Задачай было да кожнага этапу ўрока падабраць прыёмы і тэхнікі, якія належаць да сродкаў актыўнай ацэнкі. Так, на этапе пастаноўкі мэты ўдзельнікі разгледзелі такія цікавыя прыёмы, як «Яркая пляма», кроссэнс, выкарыстанне коміксаў. Для пазнавальнага этапу ўрока ўдзельнікам было прапанавана падабраць прыёмы з уласнай практыкі, якія развіваюць у навучэнцаў пэўныя кампетэнцыі: інфармацыйныя, камунікацыйныя, даследчыя, сацыяльныя. У ход пайшлі інтэлект-карты, гексы, міні-праекты, даследчы эксперымент. На рэфлексіўна-ацэначным этапе ўвага канцэнтравалася на эфектыўнай зваротнай сувязі і арганізацыі сітуацыі самаацэнкі. У выніку былі візуальна створаны гатовы канструктар кампетэнтнаснага ўрока.

А **дырэктар столінскай сярэдняй школы № 2 Ала ЛАЗІЦКАЯ** на сваім майстар-класе прымусіла ўсіх задумацца над тым, як актыўная ацэнка спрыяе прафесійнаму развіццю педагога, дзе для яго шукаць патэнцыял і без якіх кампетэнцый немагчыма ўявіць сабе сучаснага педагога. «Эфектыўна навучаць можа толькі эфектыўны настаўнік!» — упэўнена Ала Лазіцкая.

«Вельмі важна ў кожнай установе адукацыі ствараць атмасферу добразычлівасці, узаемадапамогі і партнёрства, якая шмат у чым залежыць ад адміністрацыі, — падкрэслівае Мікалай Запрудскі. — А канкурэнцыя толькі перашкаджае агульнай справе. Арганізуйце і падтрымлівайце ўзаемнае навучанне, каб носьбітам тэхналогіі АА быў не адзін педагог. Старайцеся зрабіць актыўную ацэнку прыналежнасцю ўсёй школы».

Дзесяць гадоў таму прыхільнікі актыўнай ацэнкі былі белымі варонамі. Сёння ім прасцей, таму што іх стала шмат. Зразумела, што нельга па школе выдаць загад — усім настаўнікам асвоіць новую стратэгію навучання. Пад прымусам гэта не робіцца. А можа быць, варта прыслухацца да аднаго з удзельнікаў фестывалю, які трапна заўважыў: «Для таго каб павялічыць колькасць «белых варон», трэба проста разагнаць чорных...»

**Надзея НІКАЛАЕВА,**
**фота аўтара.**




## Ахвяра прагрэсу

Як той казаў: «Быў час, быў век, была эпоха...» Некалі я працаваў у невялічкай прыватнай фірме і на работу хадзіў, можна сказаць, як на свята, бо заробкі былі добрыя, а ўжо калектыў... Ніколі б, карацей, не думаў, што сапсаваць усё можа адзін чалавек, але...

Нашай новай супрацоўніцы было блізка пад сорак. Яна завочна скончыла політэхнічны і зараз, падобна, з нейкага айчыннага «таёжнага тупіка» прыехала ў горад, каб уладкаваць асабістае жыццё. Ва ўсякім разе, праца яе, можна сказаць, не цікавіла: Надзя проста па-майстэрску «перакідвала» яе на іншых, а вось хто ў чым памыліўся, калі спазніўся, колькі разоў пакурыў і з кім чаго выпіў... Ды што там — праз свае лупы-акуляры гэта ўнучка бабы Ягі (як празвалі дзявулю нашы гумарысты) бачыла нават тое, чаго ніколі не было! І так жа нястомна... даносіла.

У выніку нашы жанчыны ў час абеду не маглі больш прабегчыся па крамах (не дай бог затрымацца ў чарзе ды на хвілінку спазніцца), нашы мужчыны — лішні раз пакурыць-пагаварыць (нават пасля работы!)... Сама ж даносчыца заставалася «чыстай і пушыстай», бо, па-першае, была роднай пляменніцай немаленькай гарадской начальніцы, па-другое, амаль нічога не рабіла, а значыць, не памылялася, дысцыпліну таксама не парушала...

Выходзіць, што яна — добры спецыяліст: такіх не звальняюць. Таму нам заставалася хіба чакаць, што здарыцца нейкі цуд: сыдзе, напрыклад, з працы тая цётка-заступніца, альбо і праўда знойдзецца нейкі дурань — возьме Надзю замуж і завязе далёка-далёка...

Вяселля, трэба сказаць, мы не прычакалі, але ж праз нейкі час жанчыны са здзіўленнем заўважылі, што наша каляжанка нібы трохі... цяжарная. А далей, як той казаў, болей!

І сапраўды, невядома ад каго (мо і праўда не бывае непрыгожых жанчын, бывае мала гарэлкі?), але Надзя нарадзіла хлопчыка.

З той вялікай радасці і ў чаканні не дэкрэтнага водпуску мы скінуліся малому на дзіцячы вазок. А вось зажыць па-ранейшаму так і не паспелі, бо... года не прайшло, як Надзея вярнулася назад на работу. Сказала, што ёй самой, на жаль, трэба зарабляць сабе грошы, што яна баіцца страціць... кваліфікацыю. А да ўсяго...

Тут, на рабочым месцы, у маладой матулі быў адмысловы кансультант — наш Мікалаевіч, бацька аж чатырох дзяцей. Раней ён па тэлефоне цярпліва адказваў Надзі на ўсе пытанні наконт купання, кармлення і сну малога, цяпер размовы пайшлі «ўжывую», і мы зноў павесілі насы.

...Збавенне прыйшло, адкуль не чакалі. Раніцай першага красавіка, пачуўшы чарговую Надзіну скаргу на дарагавізну памперсаў, наш бацька-герой (а па сумяшчальніцтве — чаго ўнучка бабы Ягі, відаць, не ведала — яшчэ і рэдкі прыкаліст) расказаў, што японцы («во дзе кемлівы народ!») прыдумалі для ванны вельмі хітры змешвальнік вады. У ім, маўляў, апроч кранікаў з гарачай і халоднай ёсць яшчэ трэці — ружовы, з якога цячэ вада тэмпературай роўна 37 градусаў. Пад такую падносіш дзіця і ўсё лішняе з яго ўміг змываеш... Зручна! А галоўнае, што гэтыя штуковіны ўжо паступілі ў продаж. Праўда, у сталічны маркет... Але ж хутка будуць і тут.

Чакаць, як потым даведаліся, наша каляжанка не стала. Назаўтра ж яна паехала ў згаданую краму, знайшла там патрэбны аддзел і прадаўца-кансультанта. Той, відаць, з першых слоў зразумеў, што ўчора — першага красавіка — гэтую жанчыну банальна разыгралі, аднак віду не падаў: паказаў з дзясятак розных бліскучых цацак... Ну, а што патрэбнай няма, — дык ён можа запісаць нумар тэлефона шаноўнай пакупніцы, і як толькі ружовыя кранікі ў краме з'явяцца, адразу ж ёй паведаміць.

...Хлопцы, якія чулі і бачылі ўсё на маніторы відэаназірання, мусіць, па-рвалі жываты ад рогату, а неўзабаве гэты запіс нехта выклаў у інтэрнэт — з усімі адсюль наступствамі.

Прыкалісту, з чыёй «падачы» гэта адбылося, вядома ж, перапала. Уляцела, відаць, і работнікам крамы. Што, дарэчы, не так і важна... Важна, што Надзея вярнулася ў свой дэкрэтны водпуск і з'ехала ў вёску да бацькоў, якія ні пра які інтэрнэт тады не чулі.

**Л. К.,**
*г. Гродна.*

## Любіш ездзіць, любі і саначкі цягаць

Дзяржава і адсочвала, і адсочвае, вядома ж, многае, але, мусіць, не ўсё. Ва ўсякім разе, на безліч друкаванай прадукцыі ніякіх стандартаў, відаць, не набярэшся. А таму асобныя друкарні часам гадамі не мянялі дызайн (тых жа табеляў-календароў), што і паспрыяла...

Зрэшты — па парадку.

То залішняя маладая энергія, то звычайная дурата час ад часу шукае выйсця ў любым калектыве. У нашым — найбольш распаўсюджаным жартам старэйшага супрацоўніка над маладымі было трывіяльнае ў той час перакідванне праводкі на цыліндрах матацыклаў. Збярэшся паехаць, прыладзішся, пачнеш заводзіць рухавік, а ён — маўчок, ні гу-гу... Што за ліха?.. Падымаеш вочы на вакно — там шчаслівы Сяргей стаіць...

Прычым красаваўся ён там досыць часта...

Сітуацыя вымагала рэваншу.

Падстава для яго падвярнулася лёгка. У нашу кантору з райаддзела міліцыі прыслалі графік тэхагляду службовага аўтатранспарту. Дырэктар, як і трэба было чакаць, «спусціў» паперу непасрэднаму выканаўцу (то-бок нашаму крыўдзіцелю). А ўжо ён глядзіць — то на гэты графік, то на свой табель-каляндар, што на стале пад шклом, — і нічога не разумее: тэхагляд запланаваны... на нядзелю. «Яны там што — з глузду паз'язджалі? Каго я збяру? У людзей выхадныя!» — абураецца Сяргей. І не каб сесці падумаць, давай адразу ж званіць у міліцыю.

Даішнікі (а іх тады — два чалавекі на раён) спачатку не маглі зразумець, чаго ад іх хочуць і ў чым вінавацяць, бо ўсё ж прызначана правільна — ніякіх выхадных...

На эмоцыях пазванілі нашаму начальству: маўляў, разбярыцеся, што за «спец» там у вас працуе?

Дырэктар спусціўся ў кабінет да Сяргея. Папрасіў:

— Пакажы ты мне свой каляндар.

Хлопец ад слова, як той казаў, выцягвае з-пад шкла паперу, а яна — бачыць — склееная з дзвюх, прычым так, што камар носа не падточыць: год «на шапцы», што называецца, бягучы, а змест — увесь... пазалеташні.

Аўтары гэтага «шэдэўрыка», як гэта водзіцца, засталіся невядомымі. А вось жартаўнік — пацішэў. Можа, успомніў вядомае: «Любіш ездзіць, любі і саначкі цягаць»?

**Іван Сіманёнак,**
*г. Паставы.*

## «Каму забарона, а каму і абарона...»

Вылазкі на Дняпро з любімым фотаапаратам я раблю досыць часта, бо рака заўсёды розная і, вядома ж, прыгожая...

Вось і ў той кастрычніцкі ранак яшчэ з агарода (вёска стаіць на ўзвышшы) згледзела, як над вадой узды маецца туман. А ўжо ж густы, бялюткі... Ну як тут не пойдзеш? Як не здымеш такое хараство?! Тым больш, што і месцы для здымак выбраны. Як у рыбакоў.

Там, куды адразу ж скіравала, добра ляшчы бяруцца. А значыць, думаю, і людзей... Як той казаў, і пешых, і конных, і баб чужых. Баялі напярэдадні, што сюды нават з Навазыбкава рыбакі прыязджаюць, на што нашы, мясцовыя, вядома ж, касерацца (бо каму спадабаецца, як нейкі там набрыдзень «твайго» ляшча з-пад носа ў цябе выцягвае?), але ж ніхто нікога не праганяе — па-суседску ловяць, па-суседску адпачываюць...

Для гэтага нашы мужчыны спецыяльнае месца абсталявалі: пад вербамі, са столікам, з лаўкамі... Каб зручна было юшкі зварыць з толькі што злоўленай рыбы, каб з ёю выпіць гарэлачкі ці вінца. І ўжо тады ў іх размоў ды плётак... Я выпадкова неяк падслухала: бабы — адпачываюць!

Але ж і навін розных шмат: хто дзе якую рыбу падняў, каго рыбнагляд злавіў, колькі штрафу ўляпілі...

Мужыкі пра гэта гавораць, а ўжо ж як пры тым мацюкаюцца!.. Божацца, што ўсе браканьеры (нават разам узятыя!) не робяць столькі шкоды ні рыбе, ні рацэ, колькі адна свінаферма на беразе. Аднак свінарнікаў з іх сцёкамі як быццам паблізу няма, а вось рыбак з сеткай — ёсць... Хоць зноў жа — паводле «градацыі» нашых мужыкоў — якраз ён і правільны, бо ловіць вялікую, дарослую рыбу. А вось той, хто кожны божы дзянёк стаіць на беразе з вудамі ды цягае з ракі драбязу, якой расці ды расці, — няправільны, нават шкодны...

Дык вось, значыць, прыйшла я да Дняпра і вачам не паверыла: ні душы там няма, рыбакоў і сваіх рыбакоў, і заезджых у Чорнае мора змыла... На беразе толькі слуп застаўся — вышынёй за два метры. А на ім, бачу, шыльда: «Купанне і лоўля рыбы забаронены!»

Аж зарагатала неспадзеўкі, бо кастрычнік на дварэ... Каму забараняць купанне? Маржоў у акрузе як быццам няма? Я таксама без купальніка... А таму шыбую сабе далей — кадры шукаю.

...Адвяла нарэшце душачку — назнімала (на гэта, дзякуй богу, забароны пакуль няма), палюбавалася яшчэ на Дняпро ды назад на свой гарод падалася.

У вёсцы ля плота, бачу, мужчына знаёмы стаіць. Пытаюся:

— Рыгор, а чаму на рыбу не ідзеш? Баішся?

— Гэта чаго? — насцярожыўся ён.

— Дык шыльда ж, — кажу, — на слупе: «Забаронена...»

Мужчына ў рогат:

— Дык гэта ж мы яе і паставілі. Злавілі: па рацэ плыла... Можа, вецер паваліў вышэй па цячэнні, а можа, з рыбакоў хто выдраў ды пусціў па вадзе... А мы паднялі, укапалі. І ты ведаеш — працуе. Ва ўсякім разе, свае — як рыбачылі, так і рыбачаць, а вось розная навалач пакуль не ідзе. Так што каму забарона, а каму і абарона...

Вось такі непарадак на нашым Дняпры.

Я потым у снежні яшчэ на здымку хадзіла — шыльда была на месцы. Вясной яна таксама стаяла. Незаконна... І куды той рыбнагляд глядзіць?

...Напісала вось, папыталася. Можа, прачытае і прыбярэ?

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# ЛЮДЗІ І ДРЭВЫ

## Пра вёскі, якія становяцца не падобнымі самі на сябе

У нас на загуменні расце ўнікальнае дрэва, на якое дзівяцца ўсе прыезджыя, — вялізны раскідзісты ясень (ці ясеніна — вясковая гаворка надзяліла яго жаночым найменнем). Наша ясеніна, без сумнення, — самае тоўстае дрэва ў наваколлі. Гадоў з дзесяць назад хлопцы з мясцовага прадпрыемства спілоўвалі ў яе галіны, якія клаліся на страху суседскага хлева, і памералі даўжыню акружнасці. Атрымалася пяць метраў семдзесят сантыметраў! Карацей, пяцёра дарослых чалавек калі і абдымуць гэта «дрэўца», дык з цяжкасцю.

Колькі ясеніне гадоў — дакладна невядома. Бабуля расказвала, што калі ішла ў 1930-м замуж на Тамашову сядзібу, дрэва ўжо было магутнае. Дакладна вядома, толькі, што яно не вырасла само, — яго пасадзіў хтосьці з маіх прапра-пра па бацькавай лініі. Пасадзіў і выгадаваў, бо вакол заўсёды было ворыва, значыць дрэва спецыяльна бераглі і абміналі касой і плугам... Для майго бацькі, для нас, для нашых дзяцей і іхніх дзяцей ясеніна была і сёння застаецца маяком роднай хаты. Яе раскідзістая верхавіна відаць здалёк, і нават у маленстве добра ведаў, куды кіраваць, каб прыйсці дадому... Я цяпер кожную вясну з трывогай назіраю, ці пачынае ясеніна распускацца. Пасля зімы дрэва доўга думае, прачынацца яму ці не. Памятаю, адзін год у самым канцы мая на ім не было яшчэ ніводнага лісточка. Я стаяла ля яго, гладзіла па шурпатай кары і ўголас прасіла ажыць, а сама ледзь не плакала. Бо проста не магла ўявіць родную сядзібу без гэтага дрэва. Калі становіцца асабліва дрэнна на душы, я, прыязджаючы дамоў, абавязкова іду да ясеніны, абдымаю, прыхінаюся да яе. Здаецца, менавіта яе карані моцна трымаюць і мяне за родную зямлю...

А яшчэ ў нас у двары заўсёды быў цянёк ад суседскіх ліп. Іх, казалі, пасадзіў ці то бацька, ці то дзед гаспадыні, якая сама нарадзілася на пачатку мінулага стагоддзя. Ліпавыя прысады былі і праз дарогу, і далей на суседнім участку. Калі яны пачыналі красаваць, ад густога водару проста станавілася млосна. А на адной з іх буслы звілі гняздо, і за тым, як яны гадуюць сваіх малых, можна было назіраць у рэжыме рэальнага часу. Ліпы ў нашай вёсцы гадоў сто з лішнім назад былі, пэўна, вельмі модным дрэвам — іх, тоўстых, раскідзістых, і па вуліцы, і на сядзібах, было ў нас шмат.

«Было» — бо, аджыўшы свой адносна нядоўгі век, яны сталі лёгкай ахвярай для летніх бурных вятроў, прывычных у апошні час. Пакрышыла бура і старыя бярозы, і кляніны. Што не дакрышыла — спілавалі электрыкі, бо аварыйныя дрэвы маглі парваць правады. Засталося толькі некалькі старых ліп і бяроз каля рэчкі ды ля школьнішча, два магутныя дубы недалёка па вуліцы, маладая ліпка ў суседскім садзе («дачка» тых, старых, суседзі проста яе не высеклі, а далей расці) ды наша ясеніна. Вёска, якая яшчэ гадоў трыццаць назад патанала ў засені дрэў, дзе ці не каля кожнай хаты стаяла ў цяньку лавачка, цяпер пячэцца пад сонцам, мокне пад дажджом, бы чалавек без адзежы. Няма каму надта сядзець на тых лавачках, але, каб і захацеў — не сядзеш на санцапёку. Вуліца ў вёсцы ўлетку шматлюдная (дый людзі не чужыя адно аднаму, хоць і дачнікі — усе адсюль родам) — пустая і гарачая. Усе перамяшчаюцца па ёй кароткімі перабежкамі, шукаючы ценю ў хаце або ў двары пад кустом ці яблыняй... Вясковых дрэваў больш няма. І не будзе, бо новыя ніхто не садзіць.

І падобная карціна не толькі на маёй радзіме. У многіх вёсках старыя дрэвы дажываюць свой век, іх ламае ці карчуе вецер або спілоўваюць спецыяльныя службы з меркаваннямі бяспекі. Гэта не бяда — так было заўсёды, бяда менавіта ў тым, што ніхто не садзіць новых. У гарадах ідзе цэлая кампанія па азеляненні, ладзяцца акцыі, падключаюцца актывісты. Падчас штогадовага тыдня лесу ўсюды высаджваюцца тысячы бяроз, дубоў, елак, сосен. Усюды — але не ў невялікіх вёсках, дый, калі шчыра, і ў тых жа аграгарадках не вельмі стараюцца азеляніць. Вуліцы з прыгожымі домікамі з'явіліся ў некаторых ужо гадоў дзесяць назад, а дагэтуль на іх — ні цянька. (Пра сады я маўчу, пладовыя дрэвы на ўчастку садзяць усе, але ж яны за хатай, да таго ж усё больш нізкарослыя.) З цягам часу нашы вёскі, якія сёння здалёк выглядаюць зялёнымі воблакамі, ператворацца ў нешта падобнае на паселішча ў стэпавай зоне з выстаўленымі на агляд пабудовамі і нізкай расліннасцю каля іх. Бо дрэва само не вырасце. Яго, калі нават насеялася і прарасло, трэба зберагчы, дагледзець, можа, і перасадзіць у зручнае месца. А вось гэтага мы рабіць не спяшаемся, не кажучы ўжо пра тое, каб самому пасадзіць ліпку ці бярозку, выкапаўшы ў полі ці прыдбаўшы ў гадавальніку. Навошта, калі на іх пасля не вырасце ні яблык, ні сліва — нічога, што можна з'есці?..

СЁЛЕТА Год малой радзімы прысвечаны добраўпарадкаванню гэтай самай малой радзімы. Пра азеляненне паселішчаў вядзецца асобная гаворка на самым высокім узроўні. Магчыма, варта да гэтай справы падключыцца не толькі ўладам гарадоў і пасёлкаў, але і сельсаветаў, у зоне адказнасці якіх — невялікія населеныя пункты...

— Першае з іх датычыцца пашырэння колькасці донараў. Мы вырашылі ўключыць у гэтае кола і стрыечных братоў і сясцёр — сваякоў «другой рукі». Гэта абумоўлена шэрагам абставін. Галоўная з іх — тое, што нашы сем'і ў асноўным невялікія. Як вынік, вельмі складана знайсці ў іх блізкіх па сваяцтве донараў, каб перасадка дала максімальна станоўчы эфект. У сваю чаргу, гэта становіцца прычынай таго, што колькасць трансплантацый ад жывых донараў у нашай краіне вельмі нізкая. Напрыклад, аперацый па трансплантацыі ныркі ад жывога донара мы выконваем менш за два працэнты. І для нас вельмі неабходна пашырыць гэтае кола — натуральна, за кошт людзей, якія дабравольна на гэта пагодзяцца.

У сувязі з гэтым уводзіцца заканадаўчае паняцце перакрыжаванага донарства. Што гэта такое? Напрыклад, ёсць чалавек, якому трэба перасадзіць печань. Але яго сваяк, які гатовы стаць донарам, мае іншую групу крыві. Як вынік — несумяшчальнасць. Пры гэтым у іншай сям'і існуе такая ж праблема, але іх донар ідэальна падыходзіць таму, хто мае патрэбу ў трансплантацыі з першай сям'і, і наадварот. Цяпер яны змогуць дапамагчы адно аднаму. Гэта значыць, стане магчымым абмен органамі паміж жывымі донарамі, якія не з'яўляюцца сваякамі.

— Гэта вельмі модная навела ў трансплантацыйным заканадаўстве ўсіх еўрапейскіх краін, а таксама ЗША, Аўстраліі, Канады, Паўднёвай Карэі, Кітая, — сцвярджае Алег Румо.

Другая частка пытанняў датычылася міжнароднага супрацоўніцтва.

— Дагэтуль у нашым заканадаўстве гэтыя аспекты асобна не пазначаліся. А час наспеў. Беларусь сёння — актыўны ўдзельнік еўрапейскага і сусветнага трансплантацыйнага супрацоўніцтва. Наша краіна стала паўнавартасным членам міжнароднай арганізацыі Foedus, мэтай якой з'яўляецца абмен органамі для трансплантацыі на бязвыплатнай аснове. І гэта вельмі важна замацаваць заканадаўча з мэтай аптымальнага падбору прадмета трансплантацыі.



— Краіна наша невялікая. І таму падабраць пару «донар — рэцыпіент» будзе куды прасцей пры большай колькасці донараў, у тым ліку і з краін замежжа, — кажа **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар СІРЭНКА.** — На жаль, былі ў нас выпадкі, калі для тых, хто меў патрэбу ў дапамозе, не знаходзілася донара, чый орган максімальна б падыходзіў.

Трэцяя частка актуальнай тэмы шліфуе праблемы, звязаныя з адзіным рэгістрам трансплантацыі, з пытаннямі згоды і адклікання такой згоды. Гэта прававая норма больш дакладна вызначае, як гэтая згода можа быць прадстаўлена.



**Міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА** адзначыў, што неабходнасць увозу і вывазу з краіны органаў, іх частак і тканак чалавека для аптымальнага падбору пары «донар — рэцыпіент» прымаецца Міністэрствам аховы здароўя. Робіцца гэта ў межах беларускага і міжнароднага заканадаўства. І абавязкова на бязвыплатнай аснове. Гэта неабходна для таго, каб выключыць нядобрасумленныя здзелкі.

Асобна Валерый Малашка спыніўся на пытанні адмовы ад забору органаў для трансплантацыі. Справа ў тым, што ў Беларусі дзейнічае так званы «нулявы» прынцып — калі чалавек пры сваім жыцці не напісаў заяву аб тым, што ён супраць таго, каб пасля яго смерці ў яго забіралі органы для перасадкі, то лічыцца, што ён аўтаматычна дае згоду на трансплантацыю. Праўда, бываюць выпадкі, калі «адмоўнік» раптоўна перадумаў і хоча ануляваць заяву.

— Змяненні ў закон рэгламентуюць парадак адклікання такой заявы. Акрамя таго, будзе канкрэтызаваны пералік тых, каму будзе дазволена гэта зрабіць, і механізм выключэння адпаведнай інфармацыі з адзінага рэгістра трансплантацыі.

А вось у апошні мяркуецца ўносіць людзей, у якіх ужо забралі орган, або яго частку, ці тканку.



## Важны крок у барацьбе з карупцыяй

**ГЕНЕРАЛЬНЫ пракурор Беларусі Аляксандр КАНЮК прадставіў членам Савета Рэспублікі Дэкрэт № 3 «Аб дадатковых мерах па барацьбе з карупцыяй».**

Выступаючы перад сенатарамі, ён адзначыў, што барацьба з карупцыяй у нашай краіне — не разавая, а пастаянная і мэтанакіраваная праца. Сведчаннем гэтага з'яўляецца рост колькасці выяўленых фактаў такога кшталту злачынстваў.



— Штогод рэгіструецца каля дзвюх тысяч карупцыйных злачынстваў. Да адказнасці прыцягваецца каля тысячы службовых асоб. З аднаго боку, гэта дрэнна. Любое карупцыйнае злачынства выклікае абурэнне ў краіне ў цэлым і на месцах у прыватнасці. З другога боку, у масе злачынстваў агульнага характару на долю карупцыі прыпадае невялікі працэнт. Летась у параўнанні з 2017 годам колькасць уліčаных карупцыйных злачынстваў прырасла на трацiну. Мы канстатуем, што распаўсюджаны факты хабарніцтва, злоўжывання і перавышэння ўлады і службовых паўнамоцтваў.

Аляксандр Канюк падкрэсліў, што барацьба з карупцыяй павінна быць рашучай і бескампраміснай на ўсіх узроўнях. Генеральны пракурор нагадаў, што Дэкрэт выдадзены для ўзмацнення мер адказнасці за здзяйсненне карупцыйных злачынстваў. У адпаведнасці з ім асобы, асуджаныя за гэта, не падлягаюць прадстаўленню да ўмоўна-датэрміновага вызвалення або замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім.

— Што да ўлічаных карупцыйных злачынстваў, то высветлены матэрыяльны ўрон на суму больш за 22 мільёны рублёў. Ён кампенсаваны на 11,9 мільёна. Арышт на маёмасць абвінавачаных і іншых датычных асоб быў накладзены на агульную суму звыш 30 мільёнаў рублёў. Гэта дазволіла забяспечыць пакрыццё нанесенай шкоды.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ** падкрэсліў, што дэкрэт — гэта важны крок у барацьбе з карупцыяй, краевугольны камень ва ўсёй сістэме антыкарупцыйнага заканадаўства.

# УВАГА — КРЫНІЦАМ ВЫПРАМЕНЬВАННЯ

**Сенатары адобрылі праект Закона «Аб радыяцыйнай бяспецы». Дзеючы дакумент працуе ажно з 1998 года. Але з таго часу прайшло больш за 20 год, змянілася многае, ды і сама Беларусь будуе сваю ўласную АЭС. А гэта значыць, што заканадаўства павінна адпавядаць цяперашнім рэаліям.**



— Палажэнні дзеючага Закона «Аб радыяцыйнай бяспецы» скіраваны на стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць ахову здароўя людзей ад іанізавальнага выпрамянення, — сказаў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Алег ЯДРАНЦАЎ.** — Сярод іншага рэалізуецца комплекс абарончых мер у сельскагаспадарчай вытворчасці, праводзяцца мерапрыемствы па ўтрыманні і функцыянаванні тэрыторый зоны адчужэння. Створана сістэма маніторынгу забруджвання наваколля, а таксама аўтаматычная сістэма маніторынгу радыяцыйнай абстаноўкі як на тэрыторыях, памежных з АЭС — чатыры станцыі, — так і ў раёне ўзвядзення нашай станцыі ў Астравецкім раёне. Мушу зазначыць, што назапашаны досвед па радыяцыйнай бяспецы пасля 1986 года ўжо выкарыстоўваецца пры ўзвядзенні Беларускай АЭС, а ў далейшым будзе ўзяты пад увагу і пры яе эксплуатацыі.

Але што ж новага прапануюць заканатворцы?



— Крыніцы іанізавальнага выпрамянення шырока выкарыстоўваюцца ў медыцыне, прамысловасці і навуцы, — зазначыў **намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Анатоль ДАЎГАЛЕВЕЦ.** — На сёння створана дастатковая заканадаўчая база, якая забяспечвае прававое рэгуляванне ў гэтай галіне. Але змяняюцца міжнародныя падыходы.

У 2014—2016 гадах МАГАТЭ ўхвалены міжнародныя патрабаванні па пытаннях бяспекі крыніц іанізавальнага выпрамянення і рэагавання на выпадкі радыяцыйных аварый. У кастрычніку 2016 года ў Беларусі праведзена місія МАГАТЭ па ацэнцы рэгуляцыйнай інфраструктуры, дадзены адпаведныя рэкамендацыі па яе ўдасканаленні. Многія з іх знайшлі сваё адлюстраванне ў прынятым Палатай прадстаўнікоў законапраекце.

Дакумент, сярод іншага, вызначае кола аб'ектаў і суб'ектаў адносін у галіне забеспячэння радыяцыйнай бяспекі, устанаўлівае агульныя патрабаванні, у тым ліку да ўзвядзення, рэканструкцыі і рамонту радыяцыйных аб'ектаў, умовы абыходжання з крыніцамі выпраменьвання. Апошняе датычыцца таксама іх увозу і вывазу з Беларусі.

Другое важнае наваўвядзенне — гэта вызначэнне прынцыпу абгрунтаванасці дзейнасці, звязанай з эксплуатацыяй надземнай катэгорыі крыніц іанізавальнага выпрамянення. А таксама — пералік відаў практычнай дзейнасці, якія ажыццяўляць нельга.

Крыніцы іанізавальнага выпрамянення будуць цяпер рэгістравацца на дзяржаўным узроўні. Анатоль Даўгалевец адзначыў, што гэта дазволіць выпрацаваць захады адносна радыяцыйнай бяспекі такой крыніцы, якая ўвозіцца ў краіну або вырабляецца тут, і яе пастаўкі карыстальніку.

— Законапраект таксама рэгламентуе магчымасць для карыстальніка крыніц выпрамянення атрымаць кансультацыі ў дачыненні радыяцыйнай бяспекі, — заявіў намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях. — Кансультацыі могуць рабіць індывідуальныя прадпрымальнікі або юрыдычныя асобы. Абавязковае патрабаванне — наяўнасць работніка, веды якога адпавядаюць патрабаванням законапраекта.

**Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# КАРЫСНЫ ДОСВЕД

## Беларусь зацікаўлена ў славацкім вопыце мясцовага самакіравання

**А Б гэтым заявіў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ журналістам па выніках сустрэчы з парламенцкай дэлегацыяй Славакіі на чале са старшынёй Нацыянальнага савета Андрэем ДАНКА.**

Як паведамляе БелТА, спікер верхняй палаты парламента праінфармаваў, што цяпер у Беларусі праводзіцца работа па магчымым унясенні змяненняў і дапаўненняў у дзеючую Канстытуцыю. У сувязі з гэтым, паводле яго слоў, актуальная тэма развіцця мясцовага самакіравання.

— Безумоўна, нас цікавілі пытанні, звязаныя з мясцовым самакіраваннем. Зараз у мэтах выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы мы працуем у гэтай сферы. І як правільна размеркаваць паўнамоцтвы паміж цэнтрам і рэгіёнамі — тут вопыт Славакіі проста неацэнны для нас, — сказаў старшыня Савета Рэспублікі.

Як адзначыў Андрэй Данка, Славакія сапраўды дасягнула пэўных поспехаў у гэтым плане. Разам з тым ёсць і некаторыя недахопы, у прыватнасці, у сферы адукацыі і аховы здароўя.

На сустрэчы бакі абмяркоўвалі таксама функцыянаванне буйных прамысловых прадпрыемстваў у сучасных эканамічных умовах. Гаворка ішла пра тое, як больш эфектыўна распарадзіцца тым інтэлектуальным і прамысловым патэнцыялам, які ў іх сканцэнтраваны. Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што развітая дагаворна-прававая база спрыяе ўмацаванню беларуска-славацкага супрацоўніцтва. Разам з тым, лічыць спікер, яе неабходна пашыраць, асабліва па тых кірунках, якія цікавыя моладзі: навука, адукацыя, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, культура, спорт. Да таго ж у Беларусі пачынае зараджацца маладзёжны парламент, і ёсць сэнс падумаць пра сумесныя мерапрыемствы для маладых палітыкаў дзвюх краін.


Фота БелТА.

Дэлегацыя Славакіі наведала музей Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальную бібліятэку. Старшыня Нацыянальнага савета выказаў захапленне тым, як Беларусь паважае сваю гісторыю, традыцыйныя каштоўнасці. Андрэй Данка таксама адзначыў якасць беларускіх прадуктаў харчавання, асабліва малочнай прадукцыі, якую таксама атрымалася пакаштаваць.

Бакі падкрэслілі значнасць і актуальнасць парламенцкага візіту такога высокага ўзроўню. Ён, упэўнены ўдзельнікі сустрэчы, паспрыяе рэальнаму паляпшэнню і ўмацаванню даверу і павелічэнню колькасці сумесных праграм і праектаў.

Таваразварот паміж Беларуссю і Славакіяй у 2018 годзе склаў 217,9 мільёна долараў. Знешнегандлёвае сальда склалася станоўчым у памеры 10,1 мільёна. У студзені — сакавіку 2019 года тавараабарот паміж краінамі склаў 54,5 мільёна долараў, павялічыўшыся на 18,5 % да аналагічнага перыяду 2018-га.

У Беларусі дзейнічаюць 11 сумесных і 7 замежных прадпрыемстваў з удзелам славацкага капіталу.

# На шляху да рэалізацыі глабальных мэт

**Н АМЕСНІК Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яна ШЧОТКІНА правяла сустрэчу з Пастаянным прадстаўніком ПРААН у Рэспубліцы Беларусь Аляксандрай САЛАЎЁВАЙ.**

Як паведамляецца на сайце верхняй палаты беларускага парламента, падчас сустрэчы абмяркоўваліся асноўныя сферы ўзаемадзеяння з ПРААН, магчымасці пашырэння партнёрства ў галіне дасягнення Мэт устойлівага развіцця. Беларусь зацікаўлена ў развіцці міжнароднага супрацоўніцтва па пытаннях дасягнення МУР і правядзенні на сваёй тэрыторыі буйных мерапрыемстваў па гэтай тэматыцы.

— Мінск можа стаць добрай пляцоўкай для арганізацыі буйных міжнародных мерапрыемстваў па Мэтах устойлівага развіцця. Нам цікавы вопыт іншых краін, і мы гатовыя падзяліцца сваім, — адзначыла Мар'яна Шчоткіна.

У лютым 2018 года ў рамках рэгіянальнага форуму па МУР у Мінску Беларусь выступіла з ініцыятывай стварэння партнёрскай сеткі нацыянальных каардынатараў па дасягненні Мэт. Гэтая прапанова была падтрымана міжнароднай супольнасцю. Вядзецца работа над прасоўваннем гэтай ініцыятывы. Да праекта ўжо праявілі цікавасць многія краіны.

Віцэ-спікер верхняй палаты парламента нагадала, што праца па дасягненні МУР у Беларусі вядзецца па чатырох асноўных кірунках: эканоміка, экалогія, сацыяльная сфера і маніторынг. Да яе актыўна прыцягваюцца бізнес-супольнасць і грамадскія арганізацыі. Асаблівая ўвага надаецца праектам з удзелам моладзі.

— Зроблена нямала, аднак важна не змяншаць тэмпы і самае галоўнае — мець канкрэтны вынік, — падкрэсліла Мар'яна Шчоткіна. Паводле яе слоў, у цяперашні час прапрацоўваецца пытанне аб стварэнні свайго роду лабараторыі па МУР, дзе маглі б акумулявацца інавацыйныя тэхналогіі і праекты, накіраваныя на дасягненне Мэт.

У сваю чаргу, Аляксандра Салаўёва адзначыла, што такога роду праекты, падтрымка інавацый у цэлым уяўляюць цікавасць для ПРААН. Яна высока ацаніла праведзеную ў краіне работу ў галіне МУР.

— Беларусь шмат у чым з'яўляецца чэмпіёнам у пытаннях дасягнення Мэт — па вопыце, абранай мадэлі і таму, як нацыяналізаваны адпаведныя індыкатары. У вашай краіне ёсць шмат лакальных ідэй і праектаў, якія могуць быць карысныя для іншых краін, — падкрэсліла Пастаянны прадстаўнік ПРААН.

Сёлета Беларусь і ПРААН павінны пачаць распрацоўку новай краінавай праграмы на 2021—2025 гады.

— Хацелася б, каб яна была ўвязана з Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага развіцця і той работай, якую вы праводзіце ў галіне МУР, — дадала яна.

Падчас сустрэчы бакі таксама абмеркавалі пытанні супрацоўніцтва ў рамках Нацыянальнага плана дзеянняў па развіцці зялёнай эканомікі.

Акрамя таго, размова ішла аб запушчанай аргкамітэтам «ЭКСПА-2020» глабальнай праграме найлепшых практык «Маленькія крокі, вялікія дасягненні: рашэнні для ўстойлівага выніку». Гэта платформа для праектаў, якія дэманструюць механізмы вырашэння найбольш складаных глабальных выклікаў. Мяркуецца, што платформа стане базісам для дэманстрацыі простых, але эфектыўных ініцыятыў, накіраваных на дасягненне Мэт устойлівага развіцця.

# ЛЕСНОЕ ХОЗЯЙСТВО В ДОСТИЖЕНИИ ЦУР

**П роблемы повышения эффективности лесопромышленного комплекса в контексте реализации Целей устойчивого развития (ЦУР) и региональной политики стали главной темой обсуждения на расширенном заседании Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению.**



В нем приняли участие министр антимонопольного регулирования и торговли Владимир Колтович, первый заместитель Национального статистического комитета Ирина Кангро, первый заместитель председателя министра лесного хозяйства Валентин Шатравко, заместитель министра экономики Дмитрий Матусевич, заместитель министра по налогам и сборам Элла Селицкая, заместитель министра природных ресурсов и охраны окружающей среды Александр Корбут, другие представители государственных органов и научной общественности.

Беларусь, располагая общей площадью земель лесного фонда в 9582 тысячи гектаров, должна получать значительно большую отдачу от лесохозяйственного производства, чем имеет сейчас.

Открывая заседание, **председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александр ПОПКОВ** отметил, что пришло время подойти к решению проблем лесной отрасли по-хозяйски, с учетом мировой практики и лучших примеров организации такой работы в нашей стране.

—Лес — это природный возобновляемый ресурс. Мы должны думать, каким образом формировать добавленную стоимость, используя этот ресурс в целях увеличения объемов экспорта готовой продукции и вклада отрасли в создание валового внутреннего продукта. И в первую очередь необходимо обратить внимание на совершенствование законодательства как основы успешного развития всего лесопромышленного комплекса.

В настоящий момент все правовые отношения в сфере лесного хозяйства регулируются Лесным кодексом, который в 2015 году был переработан с учетом развития отрасли.

Необходимые изменения и дополнения в документ были внесены и в декабре прошлого года. В результате появилось

> Необходимо обратить внимание на совершенствование законодательства как основы успешного развития всего лесопромышленного комплекса.

больше возможностей для развития лесного хозяйства, включая охрану и защиту леса, обеспечения древесиной потребителей всех форм собственности и хозяйствования.

Практически все белорусские леса сертифицированы на соответствие экологическим требованиям по международной и европейской схемам сертификации. Однако проблема эффективного использования лесных ресурсов по-прежнему в большинстве регионов страны остается пока еще не до конца решенной.

На расширенном заседании постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению было принято решение провести мониторинг практики применения законодательства в области лесного хозяйства и лесопромышленного комплекса. Для этого НАН Беларуси и Министерству лесного хозяйства предложено дать оценку правового обеспечения деятельности аналогичных отраслей в странах Евразийского экономического союза и Евросоюза. В процессе мониторинга будут проанализированы международные соглашения и договоры Республики Беларусь по охране и защите животного и растительного мира. Также специалисты изучат все проблемные вопросы, связанные с выполнением государственной программы «Белорусский лес» на 2016—2020 годы.

Белстату, Минлесхозу, министерствам экономики и по налогам и сборам рекомендовано изучить проблемы экономики лесопромышленного комплекса: эффективность работы и финансовое состояние организаций, ценовую политику и внешнюю торговлю в сфере лесного хозяйства, проблемы кадрового обеспечения и подготовки специалистов.

Также НАН Беларуси, заинтересованным министерствам и организациям предложено проанализировать практику применения и проблемы реализации законодательства об использовании, охране, защите и воспроизводстве лесов в Республике Беларусь и сформировать предложения по его усовершенствованию.

Постоянная комиссия предложила по итогам проведенного мониторинга работы во второй декаде июня рассмотреть вопрос «Правовые и экономические инструменты регулирования деятельности лесного хозяйства и лесопромышленного комплекса в контексте реализации Целей устойчивого развития и региональной политики» на заседании научно-консультативного совета по вопросам социально-экономического развития Беларуси при Президиуме Совета Республики Национального собрания.

Планируется, что предложения, поступившие в процессе проведенного мониторинга и всех состоявшихся мероприятий, лягут в основу законодательной деятельности по совершенствованию работы лесопромышленного комплекса.

**Наталья БИТЕЛЬ.**

# ШАНЦ НА РАЗВІЦЦЁ

## Як палепшыцца заканадаўства ў сферы банкруцтва

**ПЫТАННЕ неплацежаздольнасці прадпрыемстваў надзвычай складанае, бо закранае інтарэсы адразу некалькіх бакоў, якія, мякка кажучы, не заўсёды супадаюць. Інвестар жадае вярнуць укладзеныя грошы, банк — крэдыт, супрацоўнікі чакаюць выплат і жадаюць захаваць рабочае месца, уладальнік бізнесу хацеў бы пазбегнуць даўгоў, а дзяржава зацікаўлена ў спецыялістах, развіцці бізнесу і сацыяльнай стабільнасці. Пра тое, наколькі гэта праблема актуальная і як сенатары бачаць яе вырашэнне, наша размова са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімірам ПАНЦУХОВЫМ.**



**— Уладзімір Іванавіч, тэма неплацежаздольных арганізацый была прадметам абмеркавання на пасяджэнні секцыі № 2 навукова-кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі, якую вы ўзначальваеце. Наколькі востра стаіць пытанне?**

— Для Беларусі яно вельмі актуальнае. Паводле статыстыкі, па выніках студзеня — сакавіка 2019 года ўдзельная вага нерэнтабельных і нізкарэнтабельных (да пяці працэнтаў) арганізацый на 4,3 працэнтных пункта перавышае аналагічны перыяд 2018 года. Не зніжаецца і ўдзельная вага стратных арганізацый. Тэмп росту аб'ёму сродкаў, што накіроўваюцца на пагашэнне крэдытаў, за першы квартал склаў 113,6 працэнта. На пагашэнне крэдытаў і пазык у гэты перыяд арганізацыі прамысловасці трацілі кожны трэці рубель сваёй выручкі.

**— Якія прымаюцца меры, каб палепшыць сітуацыю?**

— Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 — 2020 гады прадугледжвае кіраванае вывядзенне з эканомікі неплацежаздольных дзяржаўных арганізацый, уцягванне ў эканамічны абарот іх актываў і эфектыўнае выкарыстанне працоўных рэсурсаў, якія вызваляюцца. У Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца законапраект, які павінен урэгуляваць праблемы ў гэтай сферы.

Дзеючы закон «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)» быў прыняты ў 2012 годзе, з таго часу наспела патрэба ў новых эканамічных інструментах, якія накіраваны на абарону інтарэсаў і даўжнікоў, і крэдытораў, і работнікаў, і ўласнікаў бізнесу, і дзяржавы, і грамадства.

**— Як вядома, Савет Рэспублікі маніторыць праваправымянальную практыку. Якія вынікі аналізу заканадаўства ў гэтай сферы?**

— Дзеючае заканадаўства ў большай ступені арыентавана на ліквідацыю арганізацый-банкрутаў, а не на аднаўленне плацежаздольнасці або змену ўласніка маёмасці. Паводле статыстычных даных, разгляд спраў у судах у большасці выпадкаў заканчваецца прыняццем рашэння аб ліквідацыі.

Менавіта таму неабходны пошук эфектыўных механізмаў, накіраваных на рэабілітацыю бізнесу, якія будуць забяспечваць рашэнне як мікра-, так і макраэканамічных задач. На мікраўзроўні — гэта абарона праvoў крэдытораў і аздараўленне фінансаў прадпрыемстваў, замена неэфектыўных менеджараў, на макраўзроўні — зніжэнне інвестыцыйнай рызыкі, паляпшэнне якасці фінансавай сістэмы.

**— Якія прапановы ад бізнесу прагучалі на пашыраным пасяджэнні секцыі № 2 навукова-кансультатыўнага савета?**

— Бізнес жадае роўных умоў пры банкруцтве прыватных і дзяржаўных арганізацый. Былі прапановы адносна прафесійнасці антыкрызісных кіраўнікоў. У сувязі з гэтым мы рэкамендавалі Міністэрству эканомікі спрагназаваць наступствы ўкаранення адзіных падыходаў да банкруцтва арганізацый незалежна ад формы ўласнасці, а таксама наступствы змены статусу кіраўнікоў. Прапанавалі вывучыць магчымасць прыцягнення экспертаў да правядзення ацэнкі эфектыўнага планавання працэдур банкруцтва.

Аўтары законапраекта заклалі механізм стварэння інстытута самарэгулявання. На наш погляд, гэта дазволіць аптымізаваць дзяржаўнае ўмяшанне ў рашэнне эканамічных праблем, павысіць прафесійны ўзровень і эфектыўнасць кіраўнікоў, больш рацыянальна праводзіць працэдуры банкруцтва. Бізнес не супраць гэтага інстытута як такога, але выказвае заўвагі наконт прынцыпаў яго стварэння і функцыянавання. Таму мы рэкамендавалі распрацоўшчыкам закона зноў вярнуцца да гэтага пытання, прааналізаваць дзеючыя заканадаўчыя ўмовы па ўкараненні інстытута самарэгулявання ў розных сферах грамадскіх адносін, а таксама вопыт замежных краін, у тым ліку Еўразійскага эканамічнага саюза.

Па прапанове бізнесу савет рэкамендаваў прааналізаваць мэтазгоднасць дэталёвай рэгламентацыі пытанняў забеспячэння прадстаўніцтва работнікаў арганізацый, якія знаходзяцца ў працэдурах банкруцтва.

Яшчэ адна рэкамендацыя датычыцца механізму назначэння кіраўнікоў у значныя арганізацыі рэальнага сектара эканомікі: ён павінен зменшыць рызыку некваліфікаванага кіравання. Удзельнікі савета пагадзіліся, што механізм допуску на рынак антыкрызіснага кіравання высокакваліфікаваных спецыялістаў патрабуе дадатковай прапрацоўкі.

Шэраг рэкамендацый навукова-кансультатыўнага савета датычыцца аптымізацыі заканадаўства ў сферы эканамічнага банкруцтва: размова пра нормы, якія рэгламентуюць вузкія працэдурныя пытанні, і пра тэрміны добраахвотнага звароту неплацежаздольных арганізацый у эканамічны суд. Вельмі важна своечасова ўвесці антыкрызіснае кіраванне і павысіць шанцы на стабільную работу.

Савет прапанаваў да карэкціроўкі Закона «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)» прыцягнуць найбольш кваліфікаваных юрыстаў і вучоных, каб забяспечыць баланс інтарэсаў інвестараў і дзяржавы.

Нягледзячы на тое, што пытанне ўвядзення абавязковага страхавання выплат работнікам у выпадку банкруцтва наймальніка шырока абмяркоўвалася, ёсць патрэба зноў разам з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі вывучыць гэту магчымасць.

Такім чынам, трэба захоўваць баланс інтарэсаў усіх удзельнікаў працэсу банкруцтва, імкнуцца да рэабілітацыі суб'ектаў гаспадарання, а пры ўнясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)» пазбягаць зарэгуляванасці.

Мы таксама рэкамендавалі Міністэрству фінансаў і Міністэрству па падатках і зборах разам з Міністэрствам эканомікі прапрацаваць мэтазгоднасць давання падатковым органам паўнамоцтваў на заключэнне міравых пагадненняў у працэдурах банкруцтва і ўнясення адпаведных змяненняў у падатковае заканадаўства.

Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах прадоўжыць узаемадзеянне з зацікаўленымі ў гэтай сферы бакамі, у тым ліку праз абмеркаванне праблем і выпрацоўку неабходных мер.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Навацыі «эканамічнай канстытуцыі»

## Якія нарматыўныя «абноўкі» прапануюць юрысты Грамадзянскаму кодэксу?

**ЯК правільна аформіць здзелку продажу нерухомасці, чым дабравольнае страхаванне адрозніваецца ад абавязковага, хто па законе належыць да спадчыннікаў першай чаргі і ў якіх выпадках можа аспрэчвацца завяшчанне — адказы на гэтыя пытанні можна знайсці ў Грамадзянскім кодэксе. У ім змяшчаюцца нормы, якія рэгулююць адносіны ў сацыяльна-эканамічнай сферы, таму ў асяроддзі юрыстаў яго часам называюць «эканамічнай канстытуцыяй». Але, як і Асноўны закон краіны, кодэкс таксама зараз мае патрэбу ў мадэрнізацыі. Якім чынам ідзе гэтая праца, абмяркоўвалі на пашыраным пасяджэнні навукова-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі.**

З моманту прыняцця ў 1998 годзе Грамадзянскі кодэкс удасканальваўся ўжо 60 разоў. Але заканадаўцы не паспяваюць прыстасоўваць яго да пераменлівай сацыяльна-эканамічнай рэчаіснасці, ды і змяненні ў асноўным былі фрагментарныя.

«Мэты і задачы на бягучую пяцігодку вызначаны ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады. У гэтым дакуменце не толькі замацаваны прыярытэты: інвестыцыі, занятасць, экспарт, інфарматызацыя, моладзь і гэтак далей, — але і вызначаны негатыўныя фактары, якія трэба пераадолець. У іх ліку недастатковая развітасць інстытутаў рыначнага самарэгулявання, у тым ліку бізнес-саюзаў і асацыяцый, высокая рэгулятыўная нагрузка на бізнес, недастатковы аб'ём прыцягнення прамых замежных інвестыцый па прычыне недасканаласці заканадаўства і правапрымянення, нізкая доля ўкладанняў арганізацый прыватнага сектара эканомікі, суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Удасканаленне практычна кожнай галіны заканадаўства можа зрабіць значны ўнёсак у рэалізацыю праграмных установак», — адзначыў **Віктар ЧАЙЧЫЦ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў.**

Ужо прыняты абноўлены Падатковы кодэкс, у стадыі падрыхтоўкі Кодэкс аб архітэктурнай, будаўнічай і горадабудаўнічай дзейнасці. Зараз асноўны фокус — на «эканамічнай канстытуцыі». Праца па ўдасканаленні нарматыўнаправавога акта была ўскладзена на Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў (НЦЗПД) і ўрад. Работу пачалі яшчэ ў лістападзе 2017 года.

«Большасць прававых інстытутаў грамадзянскага заканадаўства маюць патрэбу ў далейшым і больш глыбокім абнаўленні і ўдасканаленні, прычым рабіць гэта неабходна аператыўна, на якасна новай аснове. Неабходна своеасаблівая рэформа грамадзянскага заканадаўства», — лічыць **Дзмітрый БУГА, намеснік начальніка ўпраўлення заканадаўства аб грамадзянскіх, фінансава-эканамічных і экалагічных адносінах — начальнік аддзела грамадзянскага, гаспадарчага і экалагічнага заканадаўства НЦЗПД.**

Ён прапанаваў замацаваць у кодэксе прававыя інстытуты, якія будуць садзейнічаць развіццю інвестыцый, інавацый, пабудове сучаснай лічбавай эканомікі. Знойдуць месца ў праекце новага закона і такія прынцыпы, як добрасумленнасць правядзення перамоў па заключэнні дагавора, інстытут інвестыцыйнага таварыства, будзе уключана палажэнне, якое вызначыць статус самарэгулюючых арганізацый.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дзмітрый Буга пералічыў асноўныя кірункі наваўвядзенняў у дакуменце: выключэнне з Грамадзянскага кодэкса састарэлых прадпісанняў і запаўненне прабелаў, замацаванне новых інстытутаў, якія забяспечаць інвестыцыйную прывабнасць краіны (з'яўвяцца міжкрэдыторскае пагадненне, пагадненне аб пакрыцці маёмасных страт і іншыя), дадатковая абарона правоў добрасумленных удзельнікаў грамадзянскага абароту, умацаванне патэнцыялу бізнес-саюзаў, аблягчэнне доступу суб'ектаў гаспадарання да фінансавання, павышэнне прывабнасці дагавора аб сумеснай дзейнасці, перапрацоўка нормаў, прысвечаных інтэлектуальнай маёмасці і міжнароднаму прыватнаму праву.

Любыя недапрацоўкі заканадаўства асабліва бачны практыкам. У сферы права — гэта і судовая сістэма, якая з'яўляецца сувязным звяном паміж правамворчасцю і правапрымяненнем. Ад імя гэтай галіны ўлады на пасяджэнні выступіў **Андрэй ЗАБАРА, намеснік старшыні Вярхоўнага суда:** «Нам неабходна ліквідаваць разрыў у прававым рэгуляванні грамадзянскіх адносін з дзяржавамі-партнёрамі, неабходна ўкараняць новыя інстытуты грамадзянскага права, якія створаць належныя прававыя ўмовы для вядзення інавацыйнага бізнесу, пра што сёння было сказана, на гэта адведзены сціслыя тэрміны. Нам важна не памыліцца, не парушыць саму архітэктуру ўнутранай сувязі Грамадзянскага кодэкса, стварыць праблемную норму».

Андрэй Забара адзначыў, што належным сродкам рэгулявання грамадскіх адносін закон будзе, калі дакладна вызначаца механізмы рэалізацыі палажэнняў, а змест нормы будзе зразумелы не толькі прафесіяналам, але і звычайным грамадзянам.

Дарэчы, да мадэрнізацыі закона мог прычыніцца любы жадаючы — праект быў размешчаны на прававым форуме. З 50 прапаноў фарумчан улічаны 16.

Праект абноўленага кодэкса хутка паступіць у парламент. Але, па словах экспертаў, яны знаходзяцца толькі на пачатку вялікага шляху рэфармавання грамадзянскага заканадаўства.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 90

З 24 мая да 2 чэрвеня ў Мінску ў РЦАП па шахматах і шашках прайшлі чэмпіянаты Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын.

Чэмпіёнкай краіны сярод жанчын стала міжнародны грасмайстар Вера Хвашчынская (Бабруйск) — 18 ачкоў з 22 магчымых. Такі ж вынік, але з трохі горшым каэфіцыентам, прынёс сярэбраны медаль міжнароднаму майстру Яне Якубовіч. Бронзавую ўзнагароду выйграла майстар спорту Вікторыя Нікалаева — 16 ачкоў. У мужчын пераможцам выйшаў дзеючы чэмпіён свету міжнародны грасмайстар Ігар Міхальчанка (Ваўкавыск) — 18 ачкоў з 26 магчымых. Па 17 ачкоў набралі міжнародны грасмайстар Андрэй Валюк (Мінск) і яшчэ адзін прадстаўнік Ваўкавыска кандыдат у майстры Арцём Ціханаў. Лепшы каэфіцыент аддаў срэбра старшаму па званні.

Паглядзіце цікавыя фрагменты гульняў з гэтых спаборніцтваў.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым адзела.

**№ 43** А. Ціханаў — Я. Кандрачэнка.



**Белыя простыя шашкі:** a5, c1, c3, e1, f2, f4, h6 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** b8, c5, c7, d6, d8, f8, h4 (7).

Чорныя выкарыстоўвалі тактычныя нюансы пазіцыі. 13... cb4! 14.cd4 de5 15.dxf6 fe7 16.axc3 exg1 17.hg7 hg3 і неўзабаве перамаглі.

**№ 44** Я. Якубовіч — В. Хвашчынская.

**Белыя простыя шашкі:** c1, e1, f4, h4, h6 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** c5, d6, e7, f6, f8 (5).

Белыя для абароны падключылі тактыку 1.cd2 cb4 2.fe5 fd4 3.hg7 fh6 4.hg5 hf4 5.de3=

Г. Андрэеў (Латвія) даслаў свае варыяцыі на кампазіцыі, раней апублікаваныя ў нашым аддзеле.

**№ 45**

**Белыя простыя шашкі:** 13, 18, 22, 23, 29, 31, 33, 37, 40, 41, 43 (11).

**Чорныя простыя шашкі:** 2, 4, 7, 10, 11, 21, 26, 30, 34, 45 (10).

Наступная кампазіцыя складзена па правілах бразільскіх шашак.

**№ 46. Белыя простыя шашкі:** c1, f2, e3, c5, b6, d6, f6, c7 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** c3, d4, a5, h6, a7, b8, d8 (7).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 89 ад 24.05.2019.

**№ 40.** 1.b6-c7 d8:b6 2.f2-g3 h4:f2 3.g1:e7 f8:d6 4.h6:a7 h2-g1 5.d4-c5

**№ 41.** 1.b6-c7 d8:d4 2.f2-g3 h4:f2 3.g1:e7 f8:d6 4.h6:g1+

**№ 42.** 1.3328 3950 2.1813 1908 3.2823 5017 4.2721 1627 5.3203 2631 6.0320 (ЧПР заўважыў Г. Андрэеў, Латвія) 6.03x25,3136 7.2033 3641 8.3306 4147 9.0601+

Дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (пасёлак Зялёны бор Івацэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі р-н), С. Рашэцін (Ашмяны).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru.

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Тэлесеткі

### «СПОРТ-ФАКТАР» УЗНАГАРОДЗІЎ НАЙМАЦНЕЙШЫХ

Днямі фінішаваў тэлевізійны праект «Спорт-фактар», зладжаны каналам АНТ пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму Беларусі і прымеркаваны да II Еўрапейскіх гульняў. Удзел у ім узялі 24 чалавекі, падзеленыя на шэсць камандаў — бізнесмены, грамадскія дзеячы, артысты, тэлевядучыя, спартсмены і тэлегледачы, — якія на працягу двух месяцаў спаборнічалі ў розных дысцыплінах будучага спартыўнага форуму.

Удзельнікі выпрабоўвалі сябе ў стэндавай стральбе, эстафеце 4x100 метраў, веславанні на байдарцы, велатрэку і пляжным футболе. Самым траўманебяспечным відам праграмы стала велагонка, бо трэкавыя веласіпеды ў прамым сэнсе — без тармазоў. Але і пасля траўмаў і падзенняў ніхто не сышоў з дыстанцыі: бізнес-лэдзі Вольга Рачко падтрымлівала сваю каманду, нават знаходзячыся ў гіпсе!

Спаборніцтвы ішлі па алімпійскай сістэме: каманда, якая прайгравала на кожным этапе, выбывала з праекта. Наймацнейшай жа сярод усіх стала каманда грамадскіх дзеячаў «Мара», у якую ўваходзілі алімпійскі чэмпіён у веславанні на каноэ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Аляксандр Багдановіч, першы сакратар Мінскай абласной арганізацыі БРСМ Кірыл Шык, афіцыйны прадстаўнік МУС палкоўнік міліцыі Вольга Чамаданава, а таксама «Другая віцэ-міс Беларусь—2018» Настасся Лаўрыновіч. Пераможцам дастаўся галоўны прыз: кубак праекта «Спорт-фактар», білеты на цырымонію адкрыцця II Еўрапейскіх гульняў, грашовыя сертыфікаты, іменныя банкаўскія карткі ад партнёраў конкурсу. Атрымалі грашовыя прызы і спецыяльныя падарункі сярэбраная медалісты — каманда тэлегледачоў «Шторм» і бронзавыя — каманда «Бізнес-team».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**










# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Сядзі і глядзі

# «...А НОЧЧУ — АМЛЕТ!»

### 35 гадоў таму на экраны выйшла лірычная камедыя «Адзінокім даецца інтэрнат»

Для пачатку — крыху лічбаў. У 1984 годзе на Усесаюзным кінафестывалі ў Кіеве гэты фільм Самсона Самсонава атрымаў прыз як найлепшая кінакамедыя, а актрыса Наталля Гундарава па апытанні часопіса «Савецкі экран» стала найлепшай актрысай. Толькі за год фільм убачылі 23,2 мільёна гледачоў. А ў здымках узялі ўдзел 500 сапраўдных ткачых з Іванава — што праўда, потым некаторыя актывісткі з іх ліку пісалі ў газеты гнеўныя лісты, маўляў, нічога падобнага на падзеі кінастужкі ў іхніх інтэрнатах не адбываецца, і наогул фільм прыніжае і зневажае жанчын... Але час расставіў усё на належных месцах, і сёння карціна трывала ўвайшла ў залаты фонд савецкага кіно.



Пачалася ж гісторыя «Адзінокіх...» у 1980-м, калі сцэнарысту Аркадзю Ініну даслалі на пошту з розных куткоў краіны падобныя газетныя аб'явы — так і так, адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца з прыстойным мужчынам. На той час гэта гучала па-дзікунску: як гэта, жанчына сама прапануўае сябе? Але сцэнарыст убачыў за маленькімі абвесткамі вялікую праблему — адзіноты, і адправіўся ў інтэрнат станкабудаўнічага завода, дзе доўга гутарыў з дзяўчатамі, занатоўваючы кожную дэталь. Гэтыя падгледжаныя жыццёвыя гісторыі і склаліся потым у адну.

Роля цэнтральнага персанажа — передавой ткачыхі і па сумяшчальніцтве свацці Веры Голубевай — адразу прыдумвалася пад Наталлю Гундараву, хоць рэжысёр спрабаваў і іншыя варыянты. Але на здымачнай пляцоўцы аказалася, што выбар самы той. Самаахданая прадпрымальнасць і разам з тым мяккая інтэлігентнасць Гундаравай зачаравалі ўсіх.

Без спроб быў зацверджаны на ролю камендантa Віктара Пятровіча — былога марака, якога кінула жонка, — і Аляксандр Міхайлаў. Яму нават не спатрэбілася ўжывацца ў вобраз «марскога ваўка», бо акцёр калісьці насамрэч працаваў памочнікам матароса і хадзіў па Ахоцкім, Берынгавым і Японскім морах. Дарэчы, ён сам прыдумаў свайму герою суровы шрам на ўвесь твар.

Аднаго з жаніхоў, «усходняга мужчыну з пышнымі вусамі», хацелі зрабіць грузінам. Але сыграў яго армянін Фрунзік Мкртчан, ды так удала, што вобраз стаў адным з самых яскравых у фільме. Кажуць, што якраз акцёр прыдумаў сцэну, дзе яго герой прыносіць да навагодняга стала кавун (дарэчы, узімку яго знайшлі толькі на ВДНГ, дый тое мастакам па рэквізіце давялося малявацць на зялёнай ягадзе чорныя палоскі).



Хочаце наноў згадаць атмасферу дзявочага інтэрнату, убачыць гісторыю простага шчасця і пачуць словы кахання на армянскай мове? Уключыце канал «Культура» 11 і 12 чэрвеня — у гэтыя дні якраз будзе ісці «Адзінокім даецца інтэрнат».

### Сказана!

«Я не ўмею есці тое, што ты ўмееш гатаваць!»

«Гэта інтэрнат ткацкага камбіната альбо прытон у неапальскім порце?»

«Пісьменнік быў, Стэндаль. Піў чырвонае па-чорнаму».

«Вось жэнішся, тады і ўзрадуешся!»

«Дурань ты, боцман, і жарты ў цябе дурныя».

«Муж як муж. На ўзроўні сусветных стандартаў».

«Агульная кухня — гэта ж рассаднік усіх псіхалагічных канфліктаў!»

«Раніцай — яечня, днём — яечня, вечарам — яечня, а ноччу — амлет! Хутка я буду кудахтАць, як куранЯ».

«Хлопец добры, а гарэлка дрэнная».


### «Свежыя навіны ад «Звязды»!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2019 г., запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 ліпеня 2019 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.



Сярод падпісчыкаў 17 ліпеня 2019 года будуць разыграны сем умывальнікаў «Акватэкс» і суперпрыз — душавая кабіна «Акварэль». Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 ліпеня.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 верасня пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2019 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Свежыя навіны ад «Звязды»!» чытайце ў нумары 99 газеты «Звязда» ад 30.05.2019 г.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.06.2019 да 30.09.2019.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3563 ад 28.05.2019 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

### Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2019 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______ (аддзяленне сувязі) **на III квартал або II паўгоддзе 2019 года**

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ______ (індэкс) ______

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.30** Слова мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Дзень Святой Тройцы.
**6.40** Слова мітрапаліта Паўла на Дзень Святой Тройцы.
**6.50** **Меладрама «Якой яна была». 3—4-я серыі (16+).**
**8.20** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.45** **Серыял «Сваты-6» (12+).**
**10.50** «На вылет!» (12+)
**11.35** Гульні.by.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Маршрут пабудаваны (12+).
**13.15** **Меладрама «Кім мы не станем» (16+).**
**15.15** Твой горад.
**15.30** Вакол планеты.
**16.20** «Служыць закону». Дак. фільм (12+).
**16.50** **Меладрама «Ідэальны мужчына». 1—4-я серыі (12+).**
**20.40** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.10** **Меладрама «Мачаха» (12+).**

## Беларусь 2

**7.00** **Серыял «Цэнтральная бальніца» (16+).**
**8.35, 19.55** Тэлебарометр.
**8.40** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**9.40** «Свет навыварат. Японія» (16+).
**10.35** «ЖаннаПажані» (16+).
**11.40** **Трылер «Інферна» (16+).**
**13.40** **Фантастыка «Трансформеры: помста паўшых» (12+).**
**16.05, 23.35** «Арол і рэшка. Рай і пекла» (16+).
**17.05** «Тата папаў» (16+).
**17.55** «Бітва экстрасэнсаў. 17-ы сезон» (16+).
**20.25** «Абмен жонкамі» (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.05** «Тэсці лішні» (16+) [СЦ].
**23.00** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

**7.40** «Святыні Беларусі».
**8.05, 13.15, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 13.35, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30** **«Жанаты халасцяк». Камедыя (12+).**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.30** «Беларуская кухня». Вяргенікі.
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50** **«Бландзінка за вуглом». Камедыя (12+) [СЦ].**
**13.40** **«Справа Румянцава». Драма (12+).**
**15.20** Святочны канцэрт да Дня медыцынскіх работнікаў. Цырымонія ўшанавання пераможцаў конкурсу «Урач года Рэспублікі Беларусь».
**17.00** **«Снайпер-2. Тунгус». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**20.00** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** **«Квартэт Гварнеры». Маст. фільм (12+).**
**22.45** Станіслаў Манюшка. Музыка праз стагоддзі.

## Беларусь 5

**6.35** Валейбол. Залатая Еўраліга. Жанчыны. Іспанія — Беларусь.
**8.30** Футбол. Чэмпіянат свету. U-20. Фінал.
**10.25** Валейбол. Залатая Еўраліга. Мужчыны. Украіна — Беларусь.
**12.30** Піт-стоп.
**13.00** Турнір WTA. Хертагенбош. Фінал.
**15.00** Бокс. Сусветная суперсерыя. Паўфіналы.
**16.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Шахцёр» (Салігорск). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**18.50** Гандбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2020. Мужчыны. Беларусь — Фінляндыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.30** Гульні «навыраст».
**21.00** Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Рабат.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**23.45** Вынікі тыдня.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**7.45** «Жыццё іншых» (12+).
**8.40** «Метэагід».
**9.10** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.25** «Здароўе» (16+).
**10.35** **Камедыя «Іван Васілевіч мяняе прафесію» (6+).**
**12.25** «Камера. Матор. Краіна» (16+).
**14.00** «Тамара Гвердцытэлі і Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь». Канцэрт (12+).
**15.30, 16.20** «Ледніковы перыяд». Дзеці». Фінал (6+).
**18.25** «Лепш за ўсіх!» (6+)
**20.00** «Контуры».
**21.05** **Серыял «Узыходжанне на Алімп».**
**23.05** «Спартклуб» (16+).
**23.25** «Што? Дзе? Калі?» Летняя серыя гульняў (16+).
**0.35** «Ці бачылі відэа?» (6+)

## СТБ

**6.20** «Ежа багоў» (16+).
**7.55, 20.35, 23.30** Дакументальны спецпраект (16+).
**9.20** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30** «Вялікі горад».
**11.00** «Дзень сакрэтных праектаў» (16+).
**11.25, 13.40, 16.40** **«Адваротны бок Месяца». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.30** «Тыдзень».
**23.00** «Тыдзень спорту».
**1.00** **«Метад». Серыял (18+).**

## МІР

**6.00, 6.30** М/ф (0+).
**6.15** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.45** «Беларусь сёння» (12+).
**7.20** «Паляванне на працу». Прэм'ера! (12+)
**7.55** «Культ/Турызм» (16+).
**8.25** «Яшчэ танней» (12+).
**8.55** «Сусветныя гульні розуму» (0+).
**9.25** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Сусветныя лэдзі» (12+).
**10.45, 16.15, 19.30, 2.20** **Серыял «Адрыў» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам».
**20.50, 1.00** **Серыял «Пётр Першы. Завяшчанне» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** **Маст. фільм «Раман з мінулым» (12+).**
**10.30** «Смехапанарама» Яўгена Петрасяна (16+).
**11.00** Весткі.
**11.20** «Сто да аднаго» (12+).
**12.15** «Ранішняя пошта» (16+).
**13.00** «Калі ўсе дома» (12+).
**13.55** «Смяюцца дазваляецца» (16+).
**15.15** «Далёкія блізкія» (12+).
**16.20** «Выхад у людзі» (12+).
**17.25, 21.45** **Маст. фільм «Несалодкая помста» (12+).**
**20.00** Весткі тыдня.
**23.00** Масква. Крэмль. Пуцін.
**23.40** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.20** Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**6.50, 22.20** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**7.20** «Падазраюцца ўсе» (16+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**8.35** «Аднойчы...» (16+)
**9.15** «Хто ў доме гаспадар?» (16+)
**10.25** «Першая перадача» (16+).
**11.05** «Цуд тэхнікі» (12+).
**11.55** «Дачны адказ» (0+).
**13.05** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.05** **Серыял «Пераможцы» (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.05** «Зоркі сышліся» (16+).
**21.15** Ты не паверыш! (16+)
**22.50** **Драма «Бумер» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.00, 18.55, 21.10, 0.55** «Надвор'е + Эрана».
**7.05** М/ф «Баранчык Шон».
**7.15** Дак. фільм «Дзіцяняты ў дзікай прыродзе».
**7.45** М/ф «Прыгажуня і пачвара».
**9.25** «Утрамдзія».
**9.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**10.00** «Сінцзян».
**10.30** «Вячэрні квартал-95».
**12.00** Дак. фільм «Каманда 95-га квартала».
**12.45** **Фантастыка «Жалезны чалавек».**
**15.05** **«Глядзім усёй сям'ёй». Фантастыка «Чарапашкі».**
**16.50** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**17.10** «Дынастыя».
**18.10** **Серыял «Касл» (12+).**
**19.00** **Фэнтэзі «Змярканне» (16+).**
**21.00** «Вечарніца» (0+).
**21.15** **Фэнтэзі «Маладзік» (16+).**
**23.15** **Дэтэктыў «След ружовай пантэры».**



## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Наш рамонт» (16+).
**7.45** «Пары на Канары» (16+).
**8.25** «Ералаш» (6+).
**8.40** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.05** М/ф «Машкіны страшылкі» (0+).
**9.35, 23.50** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.40, 17.30** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**12.05, 5.10** «Суперамачка» (16+).
**13.10, 0.50** Серыял «Вароніны» (12+).
**14.45, 3.20** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.30** Баявік «Аднойчы ў Мексіцы: адчайны-2» (16+).
**19.00, 4.20** Серыял «Анжаліка» (16+).
**20.00** Серыял «Кухня» (16+).
**22.00** Камедыя «Нацыянальная бяспека» (12+).
**2.05** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Угліч дзівосны.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35** «Тэатральны летапіс». Ія Савіна.
**8.05** Раман у камені. «Мальта». Дак. фільм.
**8.30, 1.00** «Фатаграфіі на сцяне». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 23.50** XX стагоддзе. «Іраклій Андронікаў. Першы раз на эстрадзе». 1971 год.
**12.25** «Хто прыдумаў ксеракс?» Дак. фільм.
**13.05** 75 гадоў Давіду Галашчокіну. «Лінія жыцця».
**14.05** «Мары пра будучыню». Дак. серыял.
**15.10** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму».
**15.40** «Палярны гамбіт. Драма ў цэню легенды». Дак. фільм.
**16.25** Гісторыя мастацтва. Наталля Сямёнава. «Анры Маціс. «Танец».
**17.15, 2.30** Жыццё выдатных ідэй. «Закон хімічнай гармоніі».
**17.45** Залатыя старонкі Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага.
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Ступені цывілізацыі. «Невядомая планета Зямля» [СЦ].
**20.50** «Добрай ночы, малыя!»
**21.05** 90 гадоў Яўгену Чазаву. «Воляю лёсу». Дак. фільм.
**21.45** Колер часу. Леон Бакст.
**22.00** 75 гадоў Валянціну Смірніцкаму. «Лінія жыцця» [СЦ].
**22.55** «Спыніце Патапава!» Маст. фільм [СЦ].

## Настальгія

**6.00, 12.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**7.05, 1.25** Маст. фільм «І гэта ўсё пра яго» (16+).
**8.15** «Аншлаг». Фільм-канцэрт. 1983 год (12+).
**9.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**10.00** Фільм-спектакль «Прыйшоў мужчына да жанчыны». 1990 год (16+).
**13.00** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год (12+).
**13.45** Мульт-хіт-парад «Раненька». 1990 год (12+).
**14.50** М/ф «Казка для Наташы». 1986 год (6+).
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**15.45, 17.00, 17.45, 21.45, 23.00, 23.40, 1.15, 3.45, 5.00, 5.45** Музычная настальгія (12+).
**16.00** Кінаканцэрт «Дэтэктыў... Дэтэктыў... Дэтэктыў...» 1983 год (12+).
**17.20, 23.15, 5.20** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).
**18.00** «Двары нашага дзяцінства». 1992 год (12+).
**19.45** Тэлеспектакль «Ананімка». 1987 год (16+).
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1991-ы. 2-я частка. 2008 год (18+).
**2.30** «Не смешна». «Перад люстэркам». 1980 год (12+).
**4.00** «Колба часу» (16+).

## EuroSport 1

**0.00, 5.00, 11.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**0.50, 18.45, 21.00, 21.45, 23.55** Watts.
**1.00, 7.00, 9.30, 12.30, 15.15, 22.00** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**2.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
**2.30, 8.00, 13.30** Тэніс. «Ралан Гарос». Мужчыны. Фінал.
**4.00** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**6.00, 10.30, 17.45** Аўтагонкі. «24 гадзіны Ле-Мана».
**19.00** Шахматы. Серыя Гран-пры.
**20.00, 23.00** Тэніс. «Ралан Гарос».
**21.15** Конны спорт. Global Champions League.

## Кінакамедыя

**1.00** Пенелопа (12+).
**2.45** Другое жыццё Увэ (16+).
**4.40** Калі б я была мужчынам (18+).
**6.30** Найлепшы і самы яркі (16+).
**8.15** Вяселле па абмене (16+).
**10.00** З Неапаля з замілаваннем (12+).
**12.00** Містар Фелічыта (16+).
**13.45** Гуляй, Вася! (16+)
**15.40** Каханне з рызыкай для жыцця (16+).
**17.20** Красуня на ўсю галаву (16+).
**19.30** Любоўны менеджмент (16+).
**21.15** Вясельны разгром (18+).
**23.05** Пацучыныя бегі (12+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.15** «M&S» (12+).
**8.45** «Маленькія ўцекачы». Маст. фільм (6+).
**10.15** «Перыскоп» (16+).
**10.40, 4.15** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.20** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**12.55** «Без падману» (16+).
**13.50** «Любімая». Маст. фільм (12+).
**15.45, 23.00** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**16.20** «Мой герой» (12+).
**17.15** «Развітанне» (16+).
**18.10** «Вясковая магія». Дак. фільм (16+).
**19.05, 2.15** «Маскоўскія тайны». Серыял (12+).
**21.00** «Менталіст». Серыял (16+).
**23.55** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.40** «Кілеры». Камедыя (16+).
**3.50** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**5.05** «Часова даступны» (12+).

## ТБ1000

**6.45** Тайна сямі сясцёр (16+).
**9.10** Малавіта (16+).
**11.20** Ганна Карэніна (16+).
**13.55** Гульня Эндэра (12+).
**16.10** Сямейнае абрабаванне (16+).
**18.00** Даспехі бога: у пошуках скарбаў (12+).
**20.10** Іншапланецянін (6+).
**22.25** Скрыжалі лёсу (16+).
**0.30** Каханне і страсць. Даліда (18+).
**2.50** Вобласці цемры (16+).
**4.35** У гасцях у Эліс (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Няўлоўныя (16+).
**8.15** Піцер FM (12+).
**10.10** Я буду побач (16+).
**12.15, 4.35** Пальчатка Аўроры. 1—2-я серыі (16+).
**14.10** Снежны анёл (12+).
**16.20** Аднакласнікі.ru: наCLICKай удачу (12+).
**18.20** Чорныя кошкі (16+).
**20.20** Першыя (12+).
**22.15** Нягоднік (16+).
**0.10** Кактэбель (12+).
**2.15** 9 рота (16+).

## National Geographic

**6.00, 5.35** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.40, 14.20** Прарыў (16+).
**7.25, 13.30** Сіла племені (16+).
**8.10** Дзікі тунец (16+).
**9.40, 18.10** Варожая планета (16+).
**10.30** Каралі шахт (16+).
**11.15, 16.40, 21.20, 3.25** Аўта-SOS (16+).
**12.45** Закінутыя скарбы Егіпта (16+).
**15.05, 5.00** Мегаполісы (16+).
**15.50, 20.35, 2.40** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**19.00, 22.05, 1.10, 4.15** «Першая ізраільская месяцовая місія» (16+).
**19.45** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога (16+).
**22.50** «Космас: прамы эфір» (16+).
**23.35** Апакаліпсіс: Першая сусветная вайна (16+).
**0.20** Ліхтугі за мяжой (16+).
**1.55** Служба бяспекі аэрапорта (16+).

## Discovery

**8.00, 11.10, 15.45, 21.40** Як пабудаваць... што заўгодна (12+).
**8.25, 18.30, 1.50** Залатая ліхаманка (16+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**10.15, 17.35, 4.35** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05, 23.05** Паляўнічыя на рэліквіі (12+).
**13.00** Аперацыя «Выратаванне дома» (12+).
**13.55** Як гэта ўстроена? (12+)
**14.50, 21.15** Як гэта зроблена? (12+)
**19.25** Чыгунка Аўстраліі (12+).
**20.20, 5.30** Паляўнічыя на склады (16+).
**0.00** Амерыканскі чопер (12+).
**0.55, 6.20** Выжыць разам (12+).
**2.45** Голыя і напалоханыя (16+).
**7.10** Інжынерныя пралікі (12+).

# ГОРАД, ПРЫВАБНЫ ДЛЯ БІЗНЕСУ


Дзмітрый БАЧКОЎ і яго каманда за абмеркаваннем чарговай інвестпляцоўкі.

**Крычаў — адзін з тых гарадоў Магілёўскай вобласці, якія шмат працуюць над сваім развіццём. Менавіта тут рэалізуецца маштабны праект «Крычаў — малы разумны горад. Крычаўскі раён. Развіваемся разам», які дазволіць праз некаторы час стаць населенаму пункту першым у Беларусі смарт-сіці. Зручнае геаграфічнае становішча (усяго каля 40 кіламетраў ад Расіі), цудоўная гістарычная спадчына (адзін палацава-паркавы комплекс чаго варты), наяўнасць чыгункі, ракі, разгалінаванай сеткі аўтамабільных дарог — усё гэта робіць Крычаў прывабным для інвестараў. У рабоце з прыцягненнем прамых замежных інвестыцый задзейнічаны ўсе — пачынаючы ад старшыні райвыканкама і да простага жыхара раёна.**


Аляксандр КАМІНСКІ: «Самыя надзейныя інвестары на Дошцы гонару».

## ІНВЕСТАР ЛЮБІЦЬ РАЗУМНЫХ

— На рэгіянальны пілотны праект «Крычаў — малы разумны горад. Крычаўскі раён. Развіваемся разам» мы ўскладаем шмат спадзяванняў, — кажа **старшыня Крычаўскага райвыканкама Дзмітрый БАЧКОЎ.** — Гэта дасць магчымасць інвестару максімальна хутка атрымаць усю аб'ектыўную інфармацыю па інфраструктуры, якая ў нас ствараецца, і людскім патэнцыяле, які працуе. Будзе бачна, якія тут існуюць магчымасці для моладзі і павышэння якасці жыцця. Сёлета ў нас прайшла трэцяя рэгіянальная канферэнцыя з удзелам супрацоўнікаў аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі і Нацыянальнага кадастравага агенцтва Рэспублікі Беларусь. Гэта нашы партнёры, якія дапамагаюць рэалізоўваць праект. З імі мы абмеркавалі агульныя напрацоўкі і намецілі новыя арыенціры. У найбліжэйшых планах — зрабіць з дапамогай IT-тэхналогій «разумнымі» фермы, райвыканкам і жылы фонд. Плюс транспарт і электрычнасць. Гэтым мы палепшым якасць жыцця і магчымасці для інвестараў, бо для іх вельмі важна, хто будзе гэтыя магчымасці развіваць.

Спецыяльна для інвестараў у раёне распрацаваны дэталёвы «Інвестыцыйны пашпарт», перакладзены на англійскую і нямецкую мовы. А летась, перад тым як дэлегацыя з раёна на чале з Дзмітрыем Бачковым пабывала ў Кітаі, інвестпашпарт быў перакладзены яшчэ і на кітайскую. Як той казаў — усё для кліента.

— У нас у раёне ўжо два кітайскія інвестары, — адзначае суразмоўнік. — Другі з'явіўся пасля нашай паездкі ў Кітай. Зараз мы з ім працуем і адначасова шукаем новыя варыянты. Мы вызначылі для сябе каля 40 інвестпляцовак і дзевяць асноўных кірункаў, па якіх праводзім работу. Інвестар, што прыходзіць да нас, бачыць пляцоўкі, якія ёсць для развіцця яго бізнесу, і перспектывы. А мы з улікам яго інтарэсаў і патрабаванняў падбіраем аптымальны варыянт. Як вынік, колькасць інвестыцый паступова павялічваецца. Калі летась у раён былі прыцягнуты каля 280 тысяч долараў прамых замежных інвестыцый (а з улікам тутэйшага рэзідэнта СЭЗ — 920 тысяч), то сёлета ужо за пяць месяцаў 275 тысяч. Дарэчы, кітайская кампанія «Інфэн», якая спецыялізуецца на вырошчванні грыбоў, абасначалася ў Крычаўскім раёне яшчэ да таго, як стала рэзідэнтам СЭЗ.

### ❍ У тэму

**Аляксандр КАМІНСКІ, начальнік аддзела эканомікі Крычаўскага райвыканкама:**

— Сёлета ў наш раён прыйшлі расійскі і ўкраінскі інвестары. Апошні, напрыклад, на плошчах «Крычаўцэментнашыфера» збіраецца ствараць станкі, вытворчасць будзе называцца «Крычаўскі машынабудаўнічы завод». Развіваем адносіны з кітайцамі. Летась наша дэлегацыя пабывала ў Кітаі, а зараз чакаем іх да сябе ў госці. Інвестары прыходзяць да нас рознымі шляхамі. Кагосьці мы знаходзім і запрашаем, нехта прыязджае да нас пасля розных інвестфорумаў у Магілёве, хтосьці сам вывучае сайт райвыканкама. Бізнесменаў вабіць наша геаграфічнае становішча, тое, што ад Расіі недалёка. Прамыя інвестыцыі даюць раёну развіццё, і мы зацікаўлены, каб ахвотных укласці свае грошы было як мага болей. Для нас гэта новыя тэхналогіі, экспарт, дадатковыя рабочыя месцы, заробатная плата, напаўненне бюджэту. І бізнесу добра, і гораду на карысць.

## І ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, І СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Крычаў вядомы ў краіне дзякуючы буйному вытворцу цэменту «Крычаўцэментнашыфер». І гэты кірунак пазіцыянуецца ў раёне як адзін з перспектыўных. Наглядны прыклад — вытворчасць цэментна-стружачных пліт CSP BZS, якая адкрылася ў 2015 годзе з удзелам беларуска-аўстрыйскага капіталу. Сёння на прадпрыемстве працуе 170 чалавек, а 90 % яго прадукцыі ідзе на экспарт.


Валерый БУДЗЯНАЎ: «Такая прадукцыя ствараецца выключна на нашым крычаўскім прадпрыемстве».

— На сённяшні дзень мы адзіныя ў краіне вытворцы гэтай прадукцыі, — кажа **дырэктар СТАА «CSP BZS» Юрый ЛАРЫН.** — Асноўныя нашы спажыўцы — Расія і 14 краін Еўрасаюза, у тым ліку Польшча, Германія, Вялікабрытанія, Данія, Венгрыя. Апошнім часам шмат прадукцыі забірае Украіна. У маі адправілі ў Еўропу тавару на 512 тысяч еўра, на 8 мільёнаў рублёў у Расію і на 150 тысяч беларускіх рублёў на рынак Беларусі.

Начальнік вытворчасці Валерый Будзянаў праводзіць на склад гатовай прадукцыі. Яна там, дарэчы, не затрымліваецца. Частка пліт, зацягнутая чорнай плёнкай, чакае свайго заказчыка з Польшчы. А непадалёк ад склада ўжо стаіць фура з Украіны. Хутка пачнецца пагрузка. Наплыву пакуль няма, а вось у пятніцу, кажа Валерый Будзянаў, утвараюцца нават чэргі.

Крычаўскі офіс яшчэ аднаго інвестара знаходзіцца ў Доме Саветаў. Кітайскае ТАА «Жаня Саюз» збіраецца ствараць на тэрыторыі раёна комплекс па вырошчванні і перапрацоўцы лёну. І работа ўжо пачалася.

— Некалькі гаспадарак на дагаворных умовах дапамагаюць нам засяваць палі, — удакладняе **аграном таварыства Андрэй БАРАНАЎ.** — Шчыльна працуем з інстытутам льнаводства ў Оршы. Што датычыцца патрабаванняў, то яны стандартныя: трэба ўсё своечасова выконваць — і пытанняў не будзе.

## НЕ ПРАМЫЯ, АЛЕ Ж ТАКСАМА ІНВЕСТЫЦЫІ

Вопыт паказвае: любы сродак для прыцягнення грошай у раён добры.

— Яшчэ адзін кірунак, у якім мы працуем, гэта развіццё мясцовых ініцыятыў, — удакладняе старшыня райвыканкама Дзмітрый Бачкоў. — Удзел у розных праграмах дазваляе нам прыцягваць дадатковыя крыніцы для развіцця рэгіёна. У прыватнасці, сёлета мы ўдзельнічаем у двух праектах. Адзін звязаны з міжнароднай дапамогай па палацава-паркавым комплексе, другі — з экалагічным цэнтрам.

Летась у Крычаве быў адкрыты Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва. Дарэчы, таксама з дапамогай міжнароднага гранта. Мэта яго — развіццё ініцыятыў на мясцовым узроўні, стварэнне новых працоўных месцаў.

— Перыядычна мы праводзім семінары, дзе любы ахвотны можа азнаёміцца з асновамі вядзення бізнесу, — расказвае **спецыяліст Цэнтра Мікіта ФЁДАРАЎ.** — Апошні, напрыклад, прысвячаўся тэме, як адкрыць інтэрнэт-краму або цырульню. Сёлета некалькі чалавек прыходзіла ў цэнтр пракансультавацца, з чаго пачынаць сваю справу. Дапамагалі афармляць дакументы, кансультавалі. Адзін мужчына цікавіўся, як стварыць вытворчасць. Мы накіравалі яго ў Мінск у Банк развіцця пракансультавацца, як атрымаць грошы пад заклад. Наогул, калі ўлічваць семінары і прыватныя кансультацыі, праз нас за паўгода прайшло каля 150 чалавек.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

## ПОГЛЯД ДЭПУТАТА

**Старшыня Крычаўскага раённага Савета дэпутатаў Ірына ПРУДНІКАВА:**

— Дэпутацкі корпус праводзіць актыўную работу па прыцягненні грантаў. Пазалетась былі прафінансаваныя дзве заяўкі па тысячы долараў, летась мы выйгралі грант на 50 тысяч долараў. Праект называўся «Палацава-паркавы ансамбль — тэрыторыя экатурызму, чыстая экалогія». Рабілі яго выключна сваімі сіламі — я, старшыня Савета ветэранаў Зінаіда Скачкова, дырэктар гістарычнага музея Уладзімір Мішчанка, які паралельна ўзначальвае ў раёне маладзёжны парламент. Зараз на разглядзе яшчэ адзін праект — «Дзецям вайны клопат і ўвагу», які фінансуе міжнародны фонд Германіі «Узаемаразуменне». Яго распрацоўвала пад эгідай Савета ветэранаў Зінаіда Скачкова, а партнёрам выступіў райсавет дэпутатаў. Мы таксама сталі адным з чатырох пераможцаў конкурсу ПРААН-ГЭФ-Мінпрыроды «Беларусь: Падтрымка зялёнага горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі». У вобласці мы адзіныя, хто быў адзначаны. А ўсяго ў конкурсе прымала ўдзел каля 30 заяўнікаў. Нам будзе аказаная дапамога ў складанні праектаў па розных кірунках. Гэта і дарогі, і веларух, і экалогія, і бяспека на дарогах, і «разумныя» прыпынкі, і шмат чаго іншага для таго, каб жыхарам было камфортна ў горадзе. З праектам «Крычаў — разумны горад» гэта будзе цесна перакрыжоўвацца. А яшчэ дэпутаты рэалізавалі вельмі важную справу. Сёлета на 9 мая мы адкрылі алею герояў Вялікай Айчыннай вайны, дзе ўвекавечылі імёны ўраджэнцаў Крычаўскага раёна. Адкрылі дабрачынны разліковы рахунак пры раённым Савеце ветэранаў і сталі шукаць спонсараў. Першай адгукнулася заслужаная артыстка Беларусі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ірына Дарафеева, карані якой якраз з Крычава. Яна дала дабрачынны канцэрт, і ўсе грошы ад яго, а гэта каля 14 тысяч рублёў, папоўнілі наш рахунак. «Крычаўпраектсэрвіс» зрабіў за свой кошт праект, а «Крычаўцэментнашыфер» забяспечыў будматэрыяламі. «Камунальнік» добраўпарадкаваў тэрыторыю. Адначасова вялася работа па зверцы спісаў: першапачаткова там было 2700 чалавек, а пасля таго, як мы яго перапрацавалі, стала 3521. Іх прозвішчы пазначаны на 22 гранітных плітах. Работа працягваецца — на сённяшні дзень выяўлена яшчэ чатыры такія чалавекі. Мемарыял абышоўся прыкладна ў 55 тысяч рублёў.

# «ПАЎНОЧНЫ ВЕКТАР» З НОВЫМІ БРЭНДАМІ

## Эканамічны форум у Смаргоні завяршыўся шэрагам падпісаных кантрактаў

**Эканамічны форум аб'ядноўвае тры паўночныя раёны Гродзеншчыны — Астравецкі, Смаргонскі і Ашмянскі. Сёлета прадстаўнікі бізнес-колаў Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы, Латвіі і Украіны сабраліся ў Смаргоні, каб абмеркаваць магчымасці супрацоўніцтва ў сферах энергетыкі, лагістыкі і турызму. Упершыню форум стаў пляцоўкай прэзентацыі школьных стартап-праектаў і святам для аматараў пачаставацца арыгінальнымі абаранкамі.**

### Астравец — з перспектывай АЭС

Усе тры паўночныя раёны паспяхова развіваюцца, не спыняюцца на дасягнутым, а шукаюць новыя магчымасці і перспектывы для супрацоўніцтва.

Самым дынамічным можна назваць Астравец — горад атамшчыкаў. Будаўніцтва першай беларускай атамнай станцыі літаральна пераўтварыла маленькі гарадок. Ён значна вырас, развіваецца інфраструктура. Для замежных інвестараў раён прывабны яшчэ і тым, што знаходзіцца на мяжы з Еўрасаюзам і мае шырокую транспартную сетку — чыгунку і аўтатрасу, якая злучаецца з міжнароднай. Гэты кірунак — адзін з самых перспектыўных для прыцягнення інвестыцый.

— Генеральным планам развіцця горада энергетыкаў закладзена будаўніцтва лагістычнага комплекса побач з чыгункай, — адзначыў **старшыня Астравецкага райвыканкама Ігар ШАЛУДЗІН.** — Замежны інвестар рэалізаваў адзін такі праект побач з міжнародным пунктам пропуску «Катлоўка», дзе працуе электронная чарга. Прывабным з'яўляецца інвеставанне ў аб'екты прыдарожнага сэрвісу. На ажыўленай развязцы ў Астраўцы ёсць магчымасць пабудаваць такі шматфункцыянальны аб'ект.

Ёсць перспектывы для размяшчэння буйных вытворчых прадпрыемстваў. Сваіх інвестараў чакаюць дзве пляцоўкі са зручнымі пад'язнымі шляхамі.

Знаёмства з рэгіёнам падчас форуму прынесла свае вынікі. Так, паміж Астравецкім райвыканкамам і фондам развіцця расійска-беларускага супрацоўніцтва «Белыя росы» Санкт-Пецярбурга падпісаны дагавор аб сумеснай рабоце.

Як адзначыла **прэзідэнт фонда Ірына РОГАВА,** форум вельмі спрыяльны для беларуска-расійскага эканамічнага ўзаемадзеяння. Дзякуючы такім сустрэчам абодва бакі падпісалі пагадненне аб пастаўках беларускай прадукцыі ў Расію.

### Ашмяны — не толькі край легендаў і паданняў

Сапраўды, раён валодае высокім гісторыка-культурным патэнцыялам. Але не толькі. Як паведаміў падчас прэзентацыі раёна яго **кіраўнік Міраслаў САРАСЕК,** выгаднае геаграфічнае становішча дало падставу шырокаму спектру супрацоўніцтва.

— У нас падпісана 12 пагадненняў з рознымі рэгіёнамі шасці краін. Чарговы міжнародны форум дае новы імпульс для ўсталявання далейшых бізнес-кантактаў, — адзначыў Міраслаў Сарасек.

У рэгіёна нямала цікавых прапаноў для інвестараў у розных сферах дзейнасці. І дзелавыя партнёры адгукаюцца. Так адбылося і гэтым разам. У рамках эканамічнага форуму «Паўночны вектар» гравійна-сартавальны завод «Баруны» знайшоў партнёра на пастаўку будматэрыялаў. Кантракт на пастаўку крухмалу падпісаны паміж гальшанскім прадпрыемствам і літоўскай фірмай. Сума кантракта складае 120 тысяч долараў, а гэта 10 працэнтаў ад усёй гадавой выручкі прадпрыемства.

Падчас форуму адбылося падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Ашмянскім райвыканкамам і польскай гмінай Сувалкі.

### Форум плюс абаранкі

Новыя кантакты з'явіліся падчас міжнароднага форуму і ў гаспадароў — смаргонцаў. Нядаўна гарады-пабрацімы — Арзамас і Смаргонь — заключылі пагадненне аб супрацоўніцтве. Цяпер разглядаецца пытанне сумеснай работы Арзамаскага машынабудаўнічага і Смаргонскага агрэгатнага заводаў. Плануецца адкрыццё філіяла беларускага прадпрыемства ў Расіі. Падпісаны пагадненні паміж Смаргонскім райвыканкамам і гмінай Востраў Мазавецка Польскай Рэспублікі.

Сёлета ў праграме форума з'явіліся дзве новыя секцыі. На адной з іх былі прадстаўлены найлепшыя стартап-праекты моладзі трох раёнаў. Яшчэ адна секцыя была прысвечана вытворчасці абаранкаў у краіне. У ёй прынялі ўдзел хлебапёкі з усёй Беларусі, прадстаўнікі прыватнага бізнесу.

«Паўночны вектар» становіцца не толькі месцам для дзелавых кантактаў, але і сапраўдным святам. Падчас форуму прайшоў фестываль-кірмаш «Смаргонскія абаранкі» — новае брэндавае свята аднаго з прамысловых раёнаў Гродзеншчыны. Горад прэтэндуе на тое, каб стаць сталіцай абаранак. Калісьці слава пра гэты беларускі пачастунак разляталася па ўсёй Еўропе. Цяпер у раёне ўзнаўляюць гэтыя традыцыі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Іван ЖУК, першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:**

— У трох паўночных раёнах вобласці — Астравецкім, Ашмянскім і Смаргонскім — засяроджаны значны вытворчы патэнцыял. Тут размешчаны прадпрыемствы цяжкай, харчовай, лёгкай, дрэваапрацоўчай прамысловасці, будаўнічыя арганізацыі. Памежнае становішча спрыяе развіццю міжнароднай кааперацыі з суседзямі — літоўскімі і польскімі партнёрамі. У цэлым паўночны рэгіён вельмі перспектыўны, і ў будучыні яго чакае бурнае развіццё, асабліва з улікам будаўніцтва АЭС, першы блок якой увойдзе ў строй у канцы гэтага года.

# Ключ да паспяховай будучыні

**Сёлета ў Віцебскай вобласці для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў неабходна прыцягнуць больш за 81 мільён долараў. Аблвыканкамам сфарміраваны пералік асноўных арганізацый, якія прыцягваюць прамыя замежныя інвестыцыі на чыстай аснове. На жаль, у першым квартале адпаведны план не выкананы: замест 20 мільёнаў долараў прыцягнулі «ў абарот» 15. Але, як падкрэслівае губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ, ёсць рэзерв, улічваючы патэнцыял, які не выкарыстоўваецца. Проста з інвестарамі трэба ўмець размаўляць, каб зацікавіць укласці грошы ў канкрэтныя праекты.**

Бадай, самы грандыёзны праект на Віцебшчыне — у Мёрскім раёне. Там з удзелам замежных інвестыцый сёлета працягваецца будаўніцтва завода па вытворчасці металічнага ліста і белай бляхі. Паралельна ў раёне вырашылі займацца лячэннем і рэабілітацыяй замежнікаў з праблемамі сэрца і не толькі.

Губернатар лічыць: каб у кожным раёне меліся такія інвестары, пытанняў з развіццём, вырашэннем сацыяльных праблем, выплатай годнай зарплаты даўно б не было. Па некаторых ацэнках, памер інвестыцый у Мёршчыну — да 300 мільёнаў долараў. У Талачынскім раёне атрымае развіццё вытворчасць труб з паліпластыку. А ў Полацкім раёне працягваюць узводзіць дрэваапрацоўчы завод з выкарыстаннем высокатэхналагічнага абсталявання.

Канешне, ва ўсіх на слыху рэалізацыя буйнога інвестыцыйнага праекта ў Аршанскім раёне. Там, у гарадскім пасёлку Балбасава, будуецца мультымадальны прамыслова-лагістычны комплекс. Добрых прыкладаў паспяховай дзейнасці інвестараў на поўначы краіны ўсё больш. У прыватнасці, у Дубровенскім раёне на мяжы з Расійскай Федэрацыяй вясной мінулага года літаральна ў чыстым полі адкрылася найбуйнейшае ў Беларусі казіно з гатэлем. Расійскія інвестары «з нуля» зрабілі гэты аб'ект і месцам, дзе выступаюць, адпачываюць зоркі. Сотні жыхароў Дубровеншчыны, а таксама суседняга Аршанскага раёна і Віцебска атрымалі рабочыя месцы. Заробкі вельмі прыстойныя, падаткі ад дзейнасці казіно значна падмацоўваюць мясцовы бюджэт.

У Гарадоцкім раёне паспяхова дзейнічае расійская сельска-



У Гарадоцкім раёне паспяхова дзейнічае расійская сельскагаспадарчая кампанія «Канцэрн «Дзецкасельскі».



гаспадарчая кампанія «Канцэрн «Дзецкасельскі». Фірма інвеставала ў малочную жывёлагадоўлю. Каля дзесяці гадоў таму тут запрацаваў першы комплекс, потым пабудавалі другі... Праблем са збытам малака няма. Заробкі ў самых старанных даярак даўно ўжо больш за 500 умоўных адзінак. Але, як падкрэслілі ў аддзеле кадраў прадпрыемства, лянівых супрацоўнікаў тут наогул няма. На жаль, кадры ў дэфіцыце.

На Расоншчыне, бадай, адным з самых экалагічна чыстых раёнаў Беларусі, расійскія інвестары некалькі гадоў таму выкупілі некалькі аб'ектаў для арганізацыі турызму. Тут і ў савецкі час не была развіта прамысловасць, затое шмат лясоў, таму, лічыцца, нават паветра лечыць. У раёне два ландшафтныя заказнікі рэспубліканскага значэння — «Сіньша» і «Чырвоны Бор». На тэрыторыі першага — каскад азёр, злучаных паміж сабой ракой Дрысай. На воднай роўнядзі аднаго з азёр заказніка расце рэліктавая расліна чылім, або вадзяны арэх. І гэты факт вабіць прыезджых. Усё больш іншаземцаў цікавіць магчымасць развіцця ў раёне менавіта аздараўленчага турызму.

У раёнах, дзе адкрываецца новая вытворчасць, нярэдка праводзяцца выязныя пасяджэнні прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў. **Старшыня прадстаўнічага органа мясцовай улады Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** падкрэслівае неабходнасць пераймаць вопыт, дзяліцца напрацаванымі метадамі і спосабамі ў выкарыстанні нерухомасці і ў іншых кірунках.

Тое, што на Віцебшчыне трэба больш актыўна прыцягваць прамыя замежныя інвестыцыі, не раз агучваў спікер парламента. **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** на адным з пасяджэнняў аблвыканкама падкрэсліў, што летась паўночная вобласць краіны адзіная не выканала адпаведнае заданне. Кіраўнік ніжняй палаты парламента ўпэўнены, што менавіта прыцягненне інвестыцый — «барометр» таго, як развіваецца вобласць, раён...

Дарэчы, практыка паказвае, што, калі ў мясцовай улады добрыя стасункі з тутэйшымі дзелавымі коламі, падтрымліваюцца як пачаткоўцы, так і сталыя прадпрымальнікі, апошнія самі «прыводзяць» інвестараў. Таму разняволенне дзелавой ініцыятывы мае вялікае значэнне ў гэтым працэсе.

На месцах адказным асобам трэба разумець, што, па сутнасці, калі бізнесмены сумленна працуюць, то выконваюць фактычна дзяржаўныя задачы. Сярод іншага яны спрыяюць напаўненню бюджэту, стварэнню новых вытворчасцяў і рабочых месцаў, добраўпарадкаванню і гэтак далей.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ПРАЕКТЫ І РАШЭННІ

# СОТНЯ РАБОЧЫХ МЕСЦАЎ У ВЁСЦЫ

## Прадпрыемства з нямецкім капіталам паспяхова працуе ў глыбінцы

**У вёсцы Дзівін, на самай мяжы з Украінай, паспяхова працуе замежнае швейнае прадпрыемства. Цяпер тут занятыя больш за сто чалавек, у пераважнай большасці — жанчыны. А паўтара дзясятка гадоў таму ўсё было зусім інакш. У трохтысячным пасёлку склалася надзвычай напружаная сітуацыя з работай, асабліва пасля закрыцця камбіната надомнай працы прадпрыемства «Брэстмесцпрам».**

Жанчыны скардзіліся, хадзілі на прыём да прадстаўнікоў мясцовых органаў улады. Працаўладкаваць жа іх не было куды. А памяшканне былога камбіната плошчай больш за 1200 квадратных метраў пуставала і паступова разбуралася. Айчынныя інвестары не спяшаліся прэзентаваць свае бізнес-праекты ў населеным пункце амаль за сотню кіламетраў ад Брэста.





Кіраўнік нямецкай фірмы «Лангхайнрых» упершыню прыехаў у Дзівін у 2005 годзе. Перад гэтым прадстаўнікі арганізацыі наведвалі розныя рэгіёны вобласці, прыглядаліся да патэнцыйных пляцовак пад будучае прадпрыемства. Гэтым разам зацікаўленасць і гатоўнасць да падтрымкі праявіла кіраўніцтва раёна. Кобрынскі райвыканкам зрабіў усё магчымае, каб зацікавіць інвестара. За кошт мясцовага бюджэту была заасфальтаваная дарога ад шашы да прадпрыемства. Для нямецкага боку важнае значэнне мела таксама блізкасць да мяжы з Еўрасаюзам, аптымальная інфраструктура для дастаўкі грузаў аўтамабільным і чыгуначным транспартам, а яшчэ паўплываў той фактар, што ў Дзівіне былі кваліфікаваныя работнікі.

Адным словам, кіраўніцтва кампаніі прыняло рашэнне адкрыць у Кобрынскім раёне швейную вытворчасць. У сярэдзіне 2005 года прадпрыемства «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» было зарэгістравана. У перакладзе з нямецкай яго назва азначае «Вытворчасць Лангхайрых у Беларусі». Ужо ў жніўні 2005 года ў будынку на ўскрайку Дзівіна пачаўся рамонт. Будаўнікі мянялі дах, бетанавалі падлогу, апрацоўвалі сцены. Праз год будынак было не пазнаць, ён выглядаў як новы. Адначасова ішлі пастаўкі абсталявання і падбор спецыялістаў. З Германіі везлі швейныя машыны, электраабсталяванне, дапаможныя тэхнічныя сродкі.

Па просьбе кіраўніцтва кампаніі Дзівінскі сельвыканкам склаў спісы мясцовых майстрых кройкі і шыцця. У свой час многія з іх працавалі на камбінаце бытавога абслугоўвання, на камбінаце надомнай працы, на ткацкай фабрыцы. Жанчыны мелі добрую прафесійную падрыхтоўку, але не мелі работы. Ім разаслалі запрашэнні на сумоўе. Падборам персаналу займалася менеджар з Германіі Сімона Штольц. Цяперашняя працаўніца прадпрыемства Галіна Брышталь успамінае, як з кожнай прэтэндэнткай гутарылі паасобку і доўга. Потым тых, каго адабрала фраў Штольц, паклікалі на выпрабаванне. Дзівінчанкі два дні паказвалі свае майстэрства за швейнымі машынкамі. Пасля гэтага некаторых запрасілі на работу. Першая брыгада работніц прыступіла да працы летам 2006 года. Першую партыю абрусаў з нямецкай якасцю, зробленых у Дзівіне, адправілі заказчыку ўвосень гэтага ж года.

— З часам прадпрыемства пашырала вытворчасць, набірала новых работнікаў, і цяпер калектыў налічвае крыху больш за сто чалавек, — расказвае **галоўны інжынер фабрыкі Людміла КАРПЕШ.** — Сталовую і пасцельную бялізну з Дзівіна набываюць найбуйнейшыя гатэлі свету, чыгуначныя і авіяцыйныя кампаніі, вясковым майстрыхам даводзілася выконваць заказы для VIP-персон з каралеўскіх сем'яў.

Да нядаўняга часу ўся прадукцыя выраблялася з замежнай сыравіны і прадавалася за мяжой. Цяпер акрамя вырабу экспартных партый прадпрыемства актыўна асвойвае беларускі рынак. Камплекты пасцельнай бялізны ад «Лангхайнрых» еўрапейскай якасці маюць беларускі каларыт. Тэхнолагі і майстры выкарыстоўваюць розныя варыяцыі беларускай вышыванкі. Напрыклад, арнамент з васільком упрыгожвае самыя розныя сталовыя камплекты. Прадукцыя вясковых швейнікаў прадаецца ў Кобрыне і ў сталіцы.

У Дзівіне з гонарам расказваюць пра сваё прадпрыемства. Яго работнікі за ўвесь час ніводнага дня не былі ў водпуску за свой кошт. Зарплата выплачваецца заўсёды своечасова, і для сельскай мясцовасці яна вельмі нават неблагая. Большасць работніц жыве ў самім Дзівіне, як, напрыклад, цёзкі па прозвішчы Святлана і Валянціна Баранчук. Гісторыя іх шмат у чым паказальная. Гэта іх першае рабочае месца. Прыкладна ў адзін час павыходзілі замуж, падгадавалі дзяцей, а работу не маглі знайсці: не было асаблівага выбару ў вёсцы. Таму з радасцю прыйшлі, калі быў аб'яўлены набор швачак. На прадпрыемстве з першага дня, асвоілі ўсе аперацыі, цяпер займаюцца раскроем.

А жыхарак суседняга пасёлка Арэхаўскі і вёскі Воса на работу падвозіць мікрааўтобус, які арандуе прадпрыемства. Першая змена пачынаецца ў сем гадзін раніцы. На змену заступаюць два з паловай дзясяткі швачак, а таксама раскладчыцы, раскройшчыцы і іншыя спецыялісты. У бытавым пакоі яны пераапранаюцца ў форму, пакідаюць свае абеды ў халадзільніку, каб падчас перапынку іх разагрэць ды перакусіць. Для гэтага створаны ўсе ўмовы. У прасторным вытворчым цэху чыста, светла, тут падтрымліваюцца аптымальныя для працы ўмовы.

— Двор фабрыкі, навакольная тэрыторыя заўсёды ва ўзорным парадку, — адзначыла **старшыня Дзівінскага сельскага Савета Вера ПІКУЛА.** — Мноства кветак, дэкаратыўных кустарнікаў, арыгінальная альтанка — участак прадпрыемства служыць упрыгажэннем старадаўняга Дзівіна і падае прыклад іншым.

«Лангхайнрых Канфекцыён Бел» часта аказвае спонсарскую дапамогу грамадскім арганізацыям, дзіцячым калектывам, спартыўным секцыям. Выхаванцы Кобрынскага дзіцячага дома і Кобрынскай дзіцячай вёскі шмат разоў атрымлівалі падарункі ад швейнага прадпрыемства; дапамагалі тут і пачаткоўцам-дзюдаістам, і маленькім артыстам раённага палаца культуры. Словы падзякі на адрас кампаніі гучалі ад кіраўніцтва мясцовай памежнай заставы, ад настаяцельніцы жаночага манастыра, святароў тутэйшых цэркваў. **Дырэктар прадпрыемства Валянціна ПАШКЕВІЧ** падкрэслівае: «Калі ў нас ёсць магчымасць падтрымаць юны талент, добрае пачынанне, харошую справу, мы гэта робім з задавальненнем».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**
*Кобрынскі раён.*


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 3: МАЗ 892600, гос. номер А 1771 А-4 (прицеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов, цистерна ПЦ-8, цвет оранжевый, разрешенная масса 12000 кг, год выпуска – 2006). Начальная цена продажи лота – 3 631,66 руб. (три тысячи шестьсот тридцать один рубль шестьдесят шесть копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 363 руб. (триста шестьдесят три рубля)

ЛОТ 5: МАЗ 892600, гос. номер А 0832 А-4 (прицеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов, цистерна ПЦ-8, цвет оранжевый, разрешенная масса 12000 кг, год выпуска – 2008). Начальная цена продажи лота – 4 077,26 руб. (четыре тысячи семьдесят семь рублей двадцать шесть копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 408 руб. (четыреста восемь рублей)

ЛОТ 8: МАЗ 892600, гос. номер А 2931 А-4 (прицеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов, цистерна – ПЦ-8/2, цвет оранжевый, разрешенная масса 12000 кг, год выпуска – 2008). Начальная цена продажи лота 4 063,40 руб. (четыре тысячи шестьдесят три рубля сорок копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 406 руб. (четыреста шесть рублей)

ЛОТ 12: MAZ 9919 ППЦ-22, гос. номер А 0959 В-4 (полуприцеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов, цвет оранжевый, разрешенная масса 29737 кг, год выпуска – 2008). Начальная цена продажи лота 8 482,54 руб. (восемь тысяч четыреста восемьдесят два рубля пятьдесят четыре копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 848 руб. (восемьсот сорок восемь рублей)

Условия проведения аукциона:
– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта;
– 100 % предоплата приобретаемого объекта.
Срок заключения договора купли-продажи – 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Продавец – РУП «Белоруснефть-Гродненоблнефтепродукт», 230005, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96, тел. 45-27-03

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34

Номер р/с для перечисления задатка BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 27 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku:
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.01.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30. до 13.18.**
**Последний день приема заявлений – 24 июня 2019 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32.*
*Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*



**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1 МАЗ 9919 00, гос. номер А 3538 А-4 (полуприцеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 куб. м, цвет оранжевый, разрешенная масса 36000 кг, год выпуска – 2008).
Начальная цена продажи лота – 8 069,36 руб. (восемь тысяч шестьдесят девять рублей тридцать шесть копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 807 руб. (восемьсот семь рублей)

ЛОТ 2: ППЦ-96221-06, гос. номер А 3997 А-4 (полуприцеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 24 куб. м, цвет – оранжевый, разрешенная масса – 29 500 кг, масса без нагрузки – 8 550 кг, год выпуска – 2009).
Начальная цена продажи лота – 10 062,50 руб. (десять тысяч шестьдесят два рубля пятьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 006 руб. (одна тысяча шесть рублей)

ЛОТ 3: PPC 96227, гос. номер А 8620 А-4 (полуприцеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 24 куб. м, цвет – оранжевый, разрешенная масса – 41700 кг, масса без нагрузки – 11 700 кг, год выпуска – не определен).
Начальная цена продажи лота – 7 718,46 руб. (семь тысяч семьсот восемнадцать рублей сорок шесть копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 772 руб. (семьсот семьдесят два рубля)

ЛОТ 4: MAZ 5440 A8 360-031, гос. номер АВ 5023-4 (грузовой двухосный седельный тягач, цвет синий, разрешенная масса 18 750 кг, год выпуска – 2009).
Начальная цена продажи лота – 8 604,14 руб. (восемь тысяч шестьсот четыре рубля четырнадцать копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 860 руб. (восемьсот шестьдесят рублей)

ЛОТ 5: МАЗ 9919 012 ППЦ-22, гос. номер А 0682 А-4 (полуприцеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 куб. м, цвет оранжевый, разрешенная масса 36 000 кг, 2005 года выпуска).
Начальная цена продажи лота – 9 506,94 руб. (девять тысяч пятьсот шесть рублей девяносто четыре копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 950 руб. (девятьсот пятьдесят рублей)

ЛОТ 6: МАЗ 9919 00-012, гос. номер А 2646 А-4 (полуприцеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 куб. м, цвет оранжевый, допустимая масса 36 000 кг, масса без нагрузки – 10 250 кг, год выпуска – 2007).
Начальная цена продажи лота – 15 652,18 руб. (пятнадцать тысяч шестьсот пятьдесят два рубля восемнадцать копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 565 руб. (одна тысяча пятьсот шестьдесят пять рублей)

Условия проведения аукциона:
– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта;
– 100 % предоплата приобретаемого объекта.
Срок заключения договора купли-продажи – 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Продавец – РУП «Белоруснефть-Гродненоблнефтепродукт», 230005, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96, тел. 45-27-03

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34

Номер р/с для перечисления задатка BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 27 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 06.11.2018 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30. до 13.18.**
**Последний день приема заявлений – 24 июня 2019 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32.*
*Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**
**на строительство объекта «Многоквартирный жилой дом на ул. Серова на месте снесенного дома № 54»**

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ**

**Застройщик:** ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.

**Юридический (почтовый) адрес:** 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43, телефоны для справок: (017) 2072060, +375 (44) 7771158.

Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: понедельник – четверг с 8.15 до 16.30, обед с 12.00 до 12.45, пятница с 8.15 до 15.00, обед с 12.00 до 12.45.

В течение трех предшествующих лет ОАО «Минским домостроительный комбинат» в качестве Застройщика (заказчика) построены следующие объекты:

«16-этажный жилой дом по генплану № 12 в микрорайоне № 2 в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева», ноябрь 2013 г. – август 2015 г.;

«Многоквартирный жилой дом со встроенными административными помещениями по генплану № 13 в микрорайоне № 2 реконструируемой застройки в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)», ноябрь 2014 г. – июнь 2016 г.;

«Реконструкция застройки территории в районе улиц Михалова, Алибегова. Жилой дом № 13», апрель 2017 г – апрель 2018 г.

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА**

Заключение государственной экспертизы (положительное): РУП «Главгосстройэкспертиза» № 585-60/18 от 16.08.2018 г.

Решение Мингорисполкома «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства» от 18.10.2018 г. № 4368.

Извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства Инспекции Госстройнадзора по г. Минску от 18 марта 2019 г. № 03/68. Объект зарегистрирован 18 марта 2019 года под № 2-204Ж-011/19.

Заказчиком и генеральным подрядчиком по строительству объекта выступает ОАО «Минский домостроительный комбинат».

Начало строительства – март 2019 г. Предполагаемый Заказчиком срок приемки объекта в эксплуатацию – декабрь 2019 года.

Возводимое здание жилого дома расположено на застроенной территории на месте снесенного дома по ул. Серова, 54, в квартале смешанной жилой застройки ул. Центральной – ул. Серова – ул. Любаньской – ул. Пирогова – ул. Асаналиева в Октябрьском районе г. Минска. В районе жилой застройки функционируют школы, гимназия, детская музыкальная школа искусств, детские сады, поликлиника и другие объекты соцкульбыта (отделения банков, почта, продуктовые магазины).

Проектными решениями предусмотрено возведение крупнопанельного (в изделиях серии ОКПМ) 5-этажного, 2-секционного, 40-квартирного жилого дома с техническим подпольем, устройство 2-автомобильных плоскостных парковок на 32 машиноместа, прокладка инженерных сетей, благоустройство и озеленение прилегающей территории.

В жилом доме запроектированы 1, 2, 3-комнатные квартиры. Вертикальная технологическая связь предусмотрена по двухмаршевым лестничным клеткам, лифты отсутствуют. Устройство мусоропроводов проектом не предусмотрено.

Жилой дом сдается в эксплуатацию с выполнением полного комплекса работ по внутренней отделке квартир, которая предусматривает: укладку ламината на полу в кухне и в жилых комнатах, обои под покраску в кухне и жилых комнатах, улучшенную окраску потолков по стеклохолсту, облицовку керамической плиткой санузла, установку газовой плиты, ванны, унитаза, умывальника, установку межкомнатных дверей.

Двери входные в квартиры – металлические. Окна – из ПВХ – профиля с заполнением двухкамерными стеклопакетами. Рамы остекления лоджий – из ПВХ – профиля с заполнением однокамерными стеклопакетами.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, вентиляционные шахты, коридоры, крыша, техподполье, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельностью.

Строительство Объекта будет осуществляться в соответствии с заключенными договорами создания объектов долевого строительства (далее – договоры). Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Гражданам для заключения договоров предлагается **39** квартир, из них:

**15** однокомнатных квартир общей площадью 42,09 кв. м;
**15** двухкомнатных квартир общей площадью от 62,95 до 65,57 кв. м;
**9** трехкомнатных квартир общей площадью 71,97 кв. м;

Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры – 1250 долларов США.

Окончательная цена объекта долевого строительства определяется в договоре с учетом поэтажного расположения квартир.

Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа.

Оплата первоначального взноса в размере 30 % от цены договора осуществляется в течение 7 календарных дней с даты регистрации договора в Мингорисполкоме. Остальные выплаты по договору осуществляются ежемесячно, в соответствии с графиком платежей, до декабря 2019 года включительно.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве**

Принятие и регистрация заявлений о заключении договоров создания объектов долевого строительства от граждан и юридических лиц осуществляется отделом собственного строительства ОАО «Минский домостроительный комбинат», с 12 июня 2019 года, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (отдел собственного строительства – 3-й этаж) понедельник – четверг с 8.15 – 16.30, обед с 12.00 – 12.45, пятница с 8.15 – 15.00, обед с 12.00 – 12.45.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ОАО «Минский домостроительный комбинат» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Заключение договоров создания объекта долевого строительства осуществляется с 14 июня 2019 года.

Со дня начала заключения договоров прием и регистрация заявления на долевое строительство осуществляется при заключении договора.


УЛАСНЫ БІЗНЕС

# НЕГУЛЬНЁВАЯ СПРАВА

## Прадпрымальнікі-пачаткоўцы з рэгіёнаў усё больш цікавяцца франшызамі

**Бізнесмены разумеюць, што адкрыццё бізнесу пад ужо раскручаным брэндам — адзін з самых дзейсных спосабаў скласці канкурэнцыю буйным гульцам са сталіцы, якія адкрываюць філіялы па ўсёй краіне. Пра гэта паведаміла старшыня асацыяцыі «Белфранчайзінг» Вольга ЛЯВОНЦЬЕВА на семінары ў Полацку.**



Бясплатныя заняткі арганізаваныя праектам ПРААН і Мінэканомікі Беларусі «Малыя гарады» пры фінансавай падтрымцы Расійскай Федэрацыі. Больш за паўсотні ўдзельнікаў бліжэй пазнаёміліся з прынцыпамі пабудовы ўласнага бізнесу па франчайзінгавай мадэлі, а таксама плюсамі і мінусамі працы з вядомымі беларускімі і міжнароднымі брэндамі.

Бізнесменам-пачаткоўцам параілі звярнуць увагу галоўным чынам на фінансавы бок справы. Па-першае, сумы паўшальнага (пачатковага) узносу і роялці (штомесячных выплат ад прыбытку) у айчынных кампаній значна ніжэйшыя, чым у міжнародных і нават расійскіх. Па-другое, прадпрымальнікі змогуць у поўнай меры выкарыстаць усе перавагі работы па франчайзінгавай мадэлі, бо акрамя гучнага імя ўладальнікі франшызы перадаюць сваім партнёрам ужо гатовыя працоўныя прылады для вядзення бізнесу — ад бізнес-планаў і табліц з разлікамі бягучых выдаткаў і заробкаў работнікаў да дамоваў з пастаўшчыкамі і падрадчыкамі на ільготных умовах. Асабліва гэта актуальна для тых, хто ўпершыню вырашыў заняцца прадпрымальніцтвам і не мае багатага вопыту выбудоўвання ўласных бізнес-працэсаў.

Франчайзінг называюць выдатнай бізнес-школай. У прадпрымальнікаў-навічкоў ёсць два шляхі развіцця: прапанаваць унікальную бізнес-ідэю ці скарыстацца чужой, прычым цалкам легальна — проста купіўшы правы на франшызу.

Калі свая ідэя можа з аднолькавай верагоднасцю прывесці як да поспеху, так і да няўдачы, то ў другім варыянце можна загадзя зразумець, наколькі запатрабаваны будзе ваш бізнес. З такім падыходам згодны **Антон РЫБІНСКІ, франчайзі самага вядомага беларускага пабквіза «Мазгабойня».**

Малады чалавек вырашыў з уласнага захаплення стварыць сваю справу ў родным Наваполацку. Па словах Антона, пачаць працаваць па франшызе аказалася зусім няцяжка. Для падрыхтоўкі ўсіх дакументаў, запаўнення анкет і адкрыцця індывідуальнага прадпрымальніцтва спатрэбілася некалькі дзён і невялікая сума асабістых зберажэнняў на рахунку ў банку, а праз тыдзень франчайзі ўжо ладзіў сваю першую гульню ў мясцовым бары.

Цяпер каманда Антона двойчы на месяц праводзіць мерапрыемствы ў Полацку і Наваполацку і стабільна збірае поўныя залы аматараў пабавіць вечар за гульнёй у «Мазгабойню». Можна было б і часцей, але Антон не хоча, каб яго квізы ператвараліся ў руціну для мясцовых жыхароў.

Арганізацыя бізнесу адымае няшмат часу, таму што ўладальнікі франшызы прадстаўляюць свайму франчайзі ўсё неабходнае — ад макетаў паліграфіі і гатовых шаблонаў пастоў для сацсетак і да пытанняў і сцэнарыя.

Удзельнікам семінара ў Полацку расказалі, як з велізарнай колькасці варыянтаў абраць «сваю» франшызу і на якія крытэрыі варта звяртаць увагу ў першую чаргу.

Усяго летась у рамках праекта «Малыя гарады» прайшло 28 навучальных семінараў у Віцебскай і Магілёўскай абласцях, а таксама ў сталіцы, якія сабралі больш за тысячу ўдзельнікаў. Сёлета арганізатары працягваюць серыю семінараў і запрашаюць у рэгіёны вядучых экспертаў краіны па тэмах франчайзінгу, краўдфандынгу, лічбавага маркетынгу і іншых сучасных інструментаў развіцця малога і сярэдняга бізнесу. Усе мерапрыемствы праекта праходзяць для ўдзельнікаў бясплатна.

# МСЦІСЛАЎ СТАРАЖЫТНЫ І ЗАХАПЛЯЛЬНЫ



## На мяжы з Расіяй мясцовыя жыхары далучаюцца да турыстычнага бізнесу

**У Мсціславе прэзентаваны новы турыстычны маршрут — гэты напрамак выклікаў вялікі інтарэс у расійскіх тураператараў, перагаворы з якімі пачаліся яшчэ колькі месяцаў таму, падчас паездкі беларускіх прадпрымальнікаў на спецыялізаваныя выстаўкі ў Расію.**

На прэзентацыю маршруту прыехалі прадстаўнікі больш чым дзесяці турагенцтваў з Масквы і Смаленска. Падчас дэма-туру па Мсціславе ўдзельнікі даведаліся пра розныя варыянты знаёмства чужаземцаў з атмасферай беларускай глыбінкі: ад рыцарскіх баёў і этнічных майстар-класаў да дэгустацыі экаежы і далікатэсаў. Для зацікаўленых у партнёрстве агенцтваў стваральнікі маршруту плануюць распрацаваць асобныя турыстычныя прадукты — у залежнасці ад працягласці туру, сезона і складу экскурсійнай групы. У далейшым маршрут прапануюць і айчынным турагенцтвам, але, як паказвае досвед, асноўная плынь турыстаў у горад ідзе ўсё ж з Расіі.

Неабходнасць змены фармату маршруту, па якім цяпер возяць турыстаў, была відавочная: у Мсціслаў рэгулярна прыязджаюць экскурсійныя групы, аднак акрамя агляду помнікаў і прыгажосці мясцовага ландшафту гасцям нічога прапанаваць не маглі. Адсутнасць добра наладжанай інфраструктуры не дазваляла гораду напоўніцу выкарыстаць турыстычны патэнцыял.

Распрацоўкай новага маршруту заняўся мясцовы цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва, створаны летась дзякуючы праекту ПРААН і Міністэрства эканомікі «Малыя гарады». Асноўная задача — стварэнне магчымасцяў для мясцовых жыхароў будаваць уласны бізнес па аказанні паслуг турыстам.

«Пры стварэнні цэнтра падтрымкі мы вывучылі рынак, улічылі спецыфіку рэгіёна і ўбачылі, што найбольш перспектыўным кірункам для малога бізнесу ў Мсціславе можа стаць менавіта турызм, — адзначае **кіраўнік праекта «Малыя гарады» Марына КАЛІНОЎСКАЯ.** — Новы маршрут прадугледжвае стварэнне цэлай інтэрактыўнай праграмы вандроўкі з майстар-класамі, дэгустацыямі і нават спектаклямі з эфектам прысутнасці. Усё гэта будзе здзейснена дзякуючы прыцягненню аграсядзіб, фермераў, рамеснікаў».

Прэзентацыя маршруту скончылася ў Магілёве, дзе прайшла біржа дзелавых кантактаў сярод паўсотні прадстаўнікоў бізнесу ў турыстычнай сферы вобласці. На думку арганізатараў праекта, найвялікшы эфект у развіцці турыстычнага патэнцыялу ўсяго рэгіёна будзе дасягнуты дзякуючы аб'яднанню малога бізнесу гэтай галіны ў адзіную сістэму.

**Матэрыялы падрыхтавала Варвара МАРОЗАВА.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 6 чэрвеня 2019 года.**